КАЛОСЬСЕ

ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

КНІЖКА 1

ВІЛЬНЯ 1935 ГОД.

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—3.

Падпіска на год—4 зал., на паўгода—2 зал.
Адна кніжка—1 зал.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

З Ь М Е С Т.

Белар. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС.

Кніжка 1. **1935 г.** **Год I.**

Ад Рэдакцыі.

Звычайна, калі пачынае выходзіць новы часапіс, Рэдакцыя выясьняе, што спрычынілася да яго выдаваньня і якія мэты маюць прысьвечываць яе працы. Вось-жа і Рэдакцыя „К а л о с ь с я“ прыдзержываецца гэтага звычаю.

Аб патрэбе літаратурна-навуковага часапісу ў Заходняй Беларусі шмат гаварыць ня прыходзіцца. Яна ёсьць яснай і бясспрэчнай. Кожнаму ведама, што беларускае літаратурнае й навуковае жыцьцё ў Заходняй Беларусі зьяўляецца вельмі занядбаным. Паколькі нашае грамадзянства прыкладае вялікае значэньне да палітычна-грамадзкага жыцьця, патолькі часта не дацэнівае разьвіцьця ўласнае культуры, як-бы забываючыся аб тым, што вартасьць апошняй ёсьць вельмі вялікая. Адсутнасьць глыбейшага заінтэрасаваньня разьвіцьцём беларускай літаратуры, мастацтва й навукі ставрае тое сумнае зьявішча, што гэтыя галіны духовага жыцьця зьяўляюцца ў Заходняй Беларусі ў стане прымітыўным, а нашая Інтэлігенцыя корміцца ў значнай меры культурай чужой. Віна такога стану рэчаў крыецца ня толькі ў нас самых; яна мае й свае вонкавыя прычыны. Ёсьць імі нязвычайна цяжкія абставіны, у якіх апынуўся сяньня беларускі народ. Але гэтае апошняе не дае нам яшчэ права выракацца ўсякае ініцыятывы і быць бязьдзейнымі. У меру нашых магчымасьцяў мы мусім стойка змагацца з усякімі перашкодамі і саматужна працаваць над разьвіцьцём нашае культуры. І каб хоць у невялікай меры пабудзіць нашае грамадзянства да самастойнай культурнай працы і задаволіць яго духовыя патрэбы, мы прыступаем да выдаваньня „К а л о с ь с я“.

Мэтай „Калосься“ будзе гуртаваць усіх нашых поэтаў, пісьменьнікаў, а так-жа культурных і навуковых працаўнікоў, старэйшых і малодшых, дзеля супольнае позытыўнае працы на ніве роднае культуры. Адначасна з гэтым „Калосьсе“ будзе будзіць ініцыятыву да новых пачынаньняў, узгадоўваць маладыя літаратурныя сілы, ськіроўваючы ў найбольш адпаведным кірунку іхнія заінтэрасаваньні. Ставячы сабе так шырокія мэты, Рэдакцыя будзе старацца, каб наш часапіс меў характар агульнабеларускі і рэпрэзэнтаваў, па магчымасьці, усе віды літаратурнае творчасьці і тыя галіны навукі, якія зьвязаны беспасярэдна з беларускім адраджэньнем (артыкулы з галіны беларускае літаратуры, мовы, мастацтва, гісторыі, этнографіі і інш.). Дзеля большага контакту з літаратурна-навуковым рухам наагул, у часапісе будзе зьвяртацца вялікая ўвага на рэцэнзіі літаратурных твораў і навуковых працаў, а так-жа на справаздачы з навуковага й літаратурнага жыцьця Заходняй і Ўсходняй Беларусі.

Асаблівая ўвага будзе зьвернута на аддзел прыгожае літаратуры. Дзеля гэтага Рэдакцыя не агранічыцца да друкаваньня літаратурных твораў з Заходняе Беларусі, а будзе так-жа рабіць перадрукі важнейшых і найбольш характэрыстычных твораў поэтаў і пісьменьнікаў Беларусі Ўсходняй. Такім спосабам чытачы „Калосься“ будуць мець магчымасьць пакрысе знаёміцца з беларускай літаратурай, што разьвіваецца на той бок мяжы. Найбольш скарыстаюць на гэтым нашыя пачынаючыя поэты й пісьменьнікі, знаходзячы сабе цікавыя ўзоры, перадусім у галіне стылю, тэхнікі і поэтыцкае мовы.

Маючы наўвеце вышэйшае, Рэдакцыя зьвяртаецца да нашых поэтаў, пісьменьнікаў, культурных і навуковых працаўнікоў з заклікам ахвотнага супрацоўніцтва ў „Калосьсі“. Зьвяртаецца так-жа да ўсяго Беларускага Грамадзянства з гарачай просьбай маральнае й матар'яльнае памогі ў выдаваньні часапісу.

Рэдакцыя.

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА.

* * *

Як калосьсе ў жытняй ніве —
Цягне дух мяне ў гару.
Тут... нішто мяне ня дзівіць,
Тут... нічога не зьбяру...

Няжывой, зімовай ночай
Сьніцца мне ліпнёвы змрок,
А вясной пляла-б ахвоча
З лісьцяў восені вянок...

Цемнатою, бездарожжам
Аднаго пайшла-б шукаць:
Што ніколі мець ня можна,
Што ніхто ня можа даць.

1932 г.

Новая зіма.

У абоймах глухога спакою
Сьпіць палёў бесканечны прастор...
Зноў на шыбах мастацкай рукою
Тчэ зіма далікатны вузор.
Зноў сінеюць зімовыя далі,
Зноў зяленяцца змрокі, як лёд,
І гарыць пурпуровым пламеньнем
Няжывы і халодны заход.
А нядаўна, здаецца учора,
На блакітных палотнах нябёс
Ткалі шоўкам зялёным вузоры
Залатыя галіны бяроз.
Пахла мёднай ліпою ў паветры,
Дыхаў ласкай гарачаю змрок
І зьмяталі вячорныя ветры
Пыл з распаленых сонцам дарог.
Так нядаўна... Учора, здаецца...
Хоць сягоньня сьпявае мяцель
І на сэрца жывое кладзецца
Ледзяная, зімовая бель...

З а в е я.

Ў нярухомай самлелай цішы
Ўстаў туманны і шэры ранак.
Ціха вецер гальлё калыша,
Недзе плачуць званочкі санак...
Нізка, нізка сівыя хмары
Над зямлёю пустой клубяцца...
Ціха... Раптам віхор ударыў,
Стаў заводзіць, гудзець, сьмяяцца.
А з віхурай прышла завея
Ўсё зьмяшала, зьмяла, парвала,
Раскачала гальлё ў алеях
І паблытала...
„Мейсца, мейсца, волі, волі!"
Мкне у месьце, мкне у полі,
Вочы лепіць белай беляй
Гнеўна-сьпеўная завея.
Ўецца, б'ецца, плача, скача,
Сыпкім сьнегам сее, вее,
Не баіцца няудачаў
Гнеўна-сьпеўная завея.

Незгаданае.

Дзень стуліў залатыя расьніцы
І спачыў ў сыпкім попеле хмар.
Ў небе зорная рунь каласіцца,
Ў небе месяца зьзяе пажар.
Бесканечна—глыбокая выша
Льле ціхі і трывожны спакой,
Ноч і дражніць, і кліча... й калыша,
Ноч гуляе з душою людзкой.
Незгаданаю ўсьмешкаю Будды
Усьміхаюцца віры нябёс...
А зямля... яна сьпіць непрабудна
У паводцы нявылітых сьлёз.
І хоць гасьне між намі надзея
Пад цяжарам распачных ахвяр...
— Ў небе зорная рунь зелянее,
Ў небе месяца зьзяе пажар...

---

* * *

Калі на заходзе зьнікае
Чырвонае полымя хмараў,
А ў лесе зязюля гукае
І цемра выходзіць з гушчараў,
Калі пачынае сасоньнік
З гарачаю ночай залёты
І ў чорныя, рэчныя тоні
Ліе маладзік пазалоту...—

— З надрэчных пяскоў аксамітных,
З бяздоньняў зялёна-блакітных,
З паміж асакі шапятлівай
Трывожна, нясьмела, жальліва
Сьпеў льлецца маркотны і палкі —
Сьпеў-жальба тапельніц-русалкаў.

Выходзяць з бяздонных палацаў
На бераг халодны, пяшчаны,
Бяруцца за дзіўную працу:
Ткуць срэбрам палотны туманаў.

Сплываюць сівыя сувоі
З надрэчнай, нізкой сенажаці,
Паўзуць на паснуўшыя хвоі,
Каб зораў далёкіх дастаці...

І плачуць русалкі пры кроснах,
Так хочацца верыць, што плачуць,
Сумуюць распачна, жалосна,
Па тым, што было, няіначай...

А мо' гэта вецер шапоча
У срэбных заросьлях асокі?
Мо' вольхі цалуюцца з ночай
Над вірам ціхім і глыбокім?

Мо' гэта саўсім ня русалкі
Там чэшуць зялёныя косы,
А месяц праменны і яркі
Распальвае ночныя росы?

МІХАСЬ МАШАРА.

На пералом. .

I

Бушуйце, шалёныя хвалі,
Гайдайце у цемры чаўном!
Праменьні там ўспыхнулі ў далі,
Гэй стырнік! туды—на пралом!

Падмогі ня трэба!—ня хочам!
Надзея на гібкасьць і моц,
Мы самі усё пераможам,
Варожыя хвалі і ноч.

Ратунку, таксама, ня прымем,
Зацяжка нам ласка чужых.
Ўсё самі! рукамі сваімі
Здабудзем —
правы і мейсца жывых!

Нястрашна, што нас так нямнога.
Ня страшыць нас бурны наш пуць.
Мы—моцны!—праложым дарогу
Да сонца, праз буру і муць!

Шалейце, бурлівыя хвалі,
Гайдайце у цемры чаўном.
Свой лёс мы на вагу паклалі
І веру усю—ў пералом!

II

Ужо ён недалёка,
Ён—гэны пералом,
Затое так глыбока
І цёмна ноч кругом.

Затое вецер люты,
Запеніў хвалі так
І ціха шэпчуць Юды,
Нам нейкі тайны знак.

Яшчэ такім шалёным
Наш шлях, браты, ня быў,
Але праз цемру промень
Нам думы запаліў.

Затое крэпне вера,
Мацнее сіл уздым.
Агні, агні—бяз меры
У сэрцы маладым.

І мы з пажарам гэтым,
Як сьветачы плывём,
Да тэй сьвятлянай мэты,
Туды—на пералом!

III

Ні енку, ні стогнаў, ні сьлёзаў
Ад нас не пачуе ніхто.
Як сонца, так будзе прыгожым
За тым пераломам жыцьцё.

За крыўды, за мукі, за зьдзекі —
Награды, ні платы ня трэ'.
Мы служым Яму—Чалавеку,
Што ў сьвет наш здалёку ідзе.

Мы жуць гэтай цемры і змроку
Заменім у пышны усход.
Так даўна чаканы—здалёку,
Прыдзе на зямлю веснаход.

Улягуць шалёныя хвалі,
Заціхне і бура і гром,
І будзе далёка за намі
Змаганьне за наш пералом.

Таболы
Лістапад, 1934.

* * *

Я хачу, каб ты сьпявала
І вясёла, і заўсёды,
У жыцьці ёсьць шчасьця мала —
Болей гора, бед, маркоты.

Дарагая! шлях наш—мука,
Усіх працоўных шлях цяжкі.
Ты вось бачыш, гэты рукі
Ужо насілі ланцугі.

А за вошта?—ня пытайся...
Знаеш ты, як знаю я,
Што дарма Хрыстос расьпяўся,
Ён з зямлі ня зьняў крыжа.

Крыж, пакора і пакута...
Сказ стары, мінулых дзён...
Працы бой... вастрог і путы
Новы выкуюць закон.

На шляху працоўных сёньня
Радасьць рэдка дарагая,
Хай-жа ў песьнях радасьць звоніць!
Новых дзён красу вітаем!

* * *

Мне хочыцца сёньня расчуліцца
Між ціхага змроку і дум.
Заснула вясковая вуліца,
Ня сьпіць толькі шолах і шум.

У сэрцы наквець маразяная
Збудзіла прыгожыя сны
І скульсьці здалёку—нязваныя,
Чароўныя мроі прышлі.

І думы ідуць нейкай казкаю,
І сьняцца мне сны на яву.
Я бачу пад сьнежнаю маскаю
Ізноў цьветабой і вясну.

І чую прыліві вясьняныя,
Агнём закрынічылі кроў.
І ты—твае вочы каханыя
Нада мной пахіліліcь ізноў.

---

* * *

Пад акном, над парканам бярозка
Пахіліла галінкі ў паўсьне.
Ты шмат дум ўзгадавала мне, вёска,
Многа песень сьпяяў я табе.

Так бярозку ўсю бельлю прыгожа
Расквяцілі мароз і зіма,
А мне сьніцца ўсьцяж падарожжа
У краіну—дзе ціш забыцьця.

Так спакойна, бяз суму і жалю,
Пагадзіўшысь з жыцьцём і сабой,
Я чагосьці пакорна чакаю
Гэтай белай сьцюдзёнай зімой.

Усё спаткаю... прыму і прабачу...
Ў сэрцы болі і бунт пагашу,
Над старонкай каханай - зьвінячу
Лебядзіную песьню пяю.

А ні крыўды, ні жалю—ні трошкі,
Ні да кога ня чуе душа,
Толькі шкода мне белай бярозкі,
Што так пышна прыбрала зіма.

Хварэючы.

---

* * *

З цыклю „Вандроўнае“.

Так-бы вербай стаяць пры дарозе
І глядзець на наш родны прастор,
Дзе хвалюецца золатам збожжа
І плятуць пералескі узор.

Каласьсянае мора разгонна,
Усё ў хвалях шырока імкне,
Быццам зьнекуль скрылатыя коні,
Абганяе калосьсе мяне.

І бягуць, і бягуць зьнекуль хвалі,
Без канца, без пачатку бягуць!
Сонца неба у золаце плавіць,
Залаціцца вандроўны мой пуць.

Поле, поле! куды ён імкнецца
Тваіх ніў каласьсяны палёт?
І шуміць мне адказам здаецца:
— Усё ў жыцьцю—вечны рух наўпярод.—

---

* * *

Наўкол так прыгожа, прыгожа...
Люблю цябе красачны май!
Адходжу я зноў ў падарожжа,
Ківаючы вёсцы—бывай! —

Туды у сінявыя далі,
Іду між высокіх жытоў.
Наўкол каласьсяныя хвалі
І скромная сінь васількоў.

Іду...
На дарогу выходжу.
Пабапал разьвесіста дрэвы
На варце задумы стаяць.
Бярозы так дзіўна прыгожы
І сьвежы,
Як сьвечкі, зялёным гараць.

І хочыцца стаць на каленькі,
Прад дзівам прыгожай вясны,
Такім сябе чую маленькім
Між гэтай жывой, пераменнай красы.

О, край пералескаў зьвінячых!
О, поле, рунеючых ніў!
Я рады,
Што тут, хаця з торбай жабрачай,
Мне лёс вандраваць прысудзіў.

Асеньняй ноччу...

Як ты бязьмежна доўгая і беспрасьветна цёмная наша асеньняя ноч!

Дробныя каплі, як слёзы, павісьлі на шыбах.

За вакном рэзка сьпявае вецер.

Цягуча і тужліва шуміць гальлём вярба.

Дарма ўглядаюся ў цёмную муць акна.

Ня відаць нічога...

Толька блеклымі сьветлякамі мільгаюць вочы — агні вясковых хат...

Як сьвечкі надзеяў.

Як далёкія маякі, затрачаных у цемры, бязьлюдных астравоў.

Дарма, чуткім вухам, стараюся падслухаць анямеўшае жыцьцё вёскі, акутанай непрагляднай цемрай асеньняй ночы.

Ціха... ні гуку...

Толькі ўсьцяж шуміць тужлівая вярба, ды буйна гуляе сьпявака—вецер.

Зашуміць, закруціць гальлём вішняка і ўдарыўшы сьпеўным скрылом па шыбах, нястрымана імкне ў даль. Гэй—туды ў чорную муць! На разлогі, пусты прастор сумуючага поля.

І я ізноў адзін...

Безнадзейна адзін, стаю ў вакне заснуўшай хаты.

Толька, як на бязьлюдным астраве, на маей душы хтось ціха тчэ кросны дум.

Думы—дзеці душы.

Думы, вы мая адзінокая радасьць!

Вы—асалода жыцьця і маё пракляцьце.

Вы навучылі мяне разумець жыцьцё, шукаць яго тайніцы і любіць яго сэнс.

Вы мае сьцежкі, праз зблытаны лябірынт людзкой маны, бруду і дурноты да вялікае Праўды жыцьця і сьвету.

І вы мой цяжар, найгарэйшы мой вораг на жыцьцёвым шляху.

Вы—адабралі мой спакой, несьвядомую радасьць жыцьця, здаровы сон і залацістыя мроі.

Вы—адчынілі мае вочы...

Запалілі ў грудзях моц і трывогу.

Вы—наўчылі відзець, жадаць, кахаць і ненавідзець.

Вы напаілі сэрца хмелем творчых уздымаў і прагавітых імкненьняў.

Вы—ап'янілі душу думным самапазнаньнем людзкога—Я.

Вы—запалілі нязгаслае полымя бунту.

Вы—пасеялі сьляпы і ліпкі солад веры і ўпартую волю змаганьня.

Вы прывялі мне: — бязсоньне, пытаньні і салодкую ману сьветлых надзей.

Вы паказалі мне сьцежку да вялікай сьвятой перамогі.

Вы прымірылі з патрэбай ахвяры, мук і цярпеньняў, вядучых да мэты.

Вы навучылі кахаць магутнае гора і боль людзей.

О думы—дзеці душы!

Вы—мая радасьць, цяжар і пракляцьце.

Ізноў пусьціў хтось у рух вашы кросны.

Ізноў зашумелі вашы нястрыманыя скрылы.

Ізноў, з тужліва-сьпеўным асеньнім вятром, панясьліся вашы скрылатыя коні над разлогім прасторам родных палёў, дзе ў беспрасьветную цемру асеньняй ночы мільгаюць блеклыя сьветлякі, вячэрнія вочы—агні сялянскіх хат.

Гэтыя—сьвечкі надзеі.

Гэтыя—іскры жыцьця.

Мацней дзьмі ты, шалёны вецер.

Узьніміся, магутная бура.

Хай іскры пажарам стануць, —

Хай новым сьвітаньнем азараць беспрасьветную цемру асеньняй ночы.

Новаму году.

Я хваліць цябе буду у песьні, —
Пакланяцца ўсей мудрасьцю слоў;
Толькі будзь ты жаданай прадвесьняй,
Тых надходзячых новых часоў.

Нашы душы засьмяглі ў чаканьню
Новай праўды на нашай зямлі.
Прынясі ты нам промень сьвітаньня
Брацкай згоды,— вялікай сям'і.

Ў нашым сьвеце цяпер невясёла;
Поўна крыўды і бед нарасло.
Прынясі нам Вялікае Слова,
Што з пачатку у Бога было.

Мы шукаем ў пацёмках дарогу,
Зьнямагаем ў няроўным баю.
Прынясі ты—над злом перамогу
І магутны спакой на зямлю!

Таболы.
Сьнежань 1934 г.

Ліст *)

Дарагі * * *

Ты просіш вершаў, слаўны дружа,
(І проза нават можа быць).
Ў маіх грудзёх зьнямогі сьцюжа
І ліра звонкая маўчыць.

Будзённа шэрыя патрэбы,
Клапоты беднасьці і бед,
За чорны луст сухога хлеба
Жыцьцё марнуе твой паэт.

О друг!.. Цяпер мне не да вершаў,
Як нават пару год назад,
Хоць на пераклічцы стануць першым
Я ўсей душой і сяньня рад.

Я песьні ўсьцяж люблю... і ў сэрцы
Крынічыць песенная брэдзь,
Але асуджан, —ў паняверцы
Маўчаць, таміцца і мадзець.

Хоць сэрцу сьняцца васілёчкі
І пышны майскі цьветабой, —
Ў чужым сшытку выводжу строчкі
Траплом, лапатай і касой.

Нясмачны хлеб і лёс найміта,
Так бедна зьместам тут усё,
Дык як-жа быць мне тут поэтам
І славіць песьнямі жыцьцё?..

в. Таболы,
25.-XI. 1934 г.

---

*) Адказ на ліст аднаго з Рэдактароў „Калосься" з просьбаю прыслаць да друку літ. твораў. Рэдакцыя.

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

Я ня знаю...

Я ня знаю, чаму я павінен
Сэрца ў вершах паліць без адчаю?..
Адно цешыць мяне —
што ў Краіне...
Я ня першы у песьнях згараю.
Быццам жрэц словаў ціхіх, пакорных
Я закляцьце раблю над імі,
Каб у вершы —
Словаў узоры
Зьзялі пацеркамі дарагімі.

1933 г.

---

* * *

Лягчэйшы ўздох.
І погляд вачэй прыяцельскі —
На нітках —
дратох —
Вечар нанізывае пацеркі.
Цені людзей
Мігцяць ля сьценаў, між дрэвамі.
Не'к прыямней
Дражняцца вулкі сьпевамі.
Ў сэрцы цяпер
Настрой тужлівы раптам сьціх.
Кароткі верш!
Выплесьні накіп радасьці!
У словах двух—трох
Тайну скажу па-прыяцельску —
На нітках —
дратох —
вечар —
нанізывае... пацеркі...

1933 г.

М. ДАЛЬНЫ.

На дарогу.

Андрэй радзіўся ў вёсцы Макаршчыне. У яго сінявых вачох — серабрысты адліў. І, здаецца, яны насычаны неабнятай дальлю вясковай. А ў твар, здаецца, вось-вось, толькі што, веялі сьвежыя вятры прастораў вольных. Калі ён сядзіць у студэнскай сталоўцы—быстрыя вочы дзяўчат даўжэй затрымліваюцца на ім. Ён дзелавіта есьць, як-бы за хатай стаіць запрэжаны конь. Гарацьзараз паедзем.

Вёска Макаршчына жыла вякамі. Папросту: жыла і праходзіў час. Прыйшлі сюды калісь людзі. Можа ад Макара яна й назвалася. Пачалі лес церабіць. Паявілася хатка—адна, другая. Праз сотні гадоў—вось яна многахатняя, многахлеўная, гаманкая, з шнюрамі ворнай зямлі, выдзертай цяжкой працай моцных рук. Летнімі вечарамі, калі пахлі кветкі ля хат і ў серабрыстым тумане чулася дыханьне зямлі, ля кустоў расла вёска. З лесу, з працы ўпорнай вышла вёска і стала насупроць вятроў з заходу й з паўдня, з поўначы і з усходу. На вуліцы, ля платоў віўся гармані-сты смутак і між яго ўпляtaўся малады сьмех... праскрыпіць студня зімой. Звонкі голас пачуецца. Шпарка пройдзе нехта па вуліцы... Вякамі... паміралі дзяды, і бацькі, і дзеці. А жылі-ж яны вось тут, хадзілі, працавалі, гаманілі. І дзе цяпер? Незразумела гэта. Страшна гэта. Жудасна. Няўхілна.

„А, мой ты, міленькі, а мой ты, галубчык"... Вякамі...

Часамі пралятаы буры і ўся вёска тамілася ў страсе: каб-жа шчасьлівенька... Часамі пралятаы буры, але яны абміналі вёску. Вякамі плыло жыцьцё... Цяпер вось чыгунка блізка вёскі. Андрэй першы чалавек з вёскі, які стаўся вялікім. Паехаў далёка, у места вялікае. А сталася гэта прыпадкова, бо Андрэя дарма вучылі.

— Во, разумны такі, а не спанеў. Вёска ажыла. З Андрэем-жа разам на сенажаці дурэлі. А цяпер — ён газэтку выпісаў. Вучыцца ў унівэрсытэт паехаў. Паехаў Андрэй, а жыцьцё пастарому плыло. Толькі ў сэрцы дзявочым жаль і тугу выклікаў.

Замятае сьнег вёску. Налятаюць ветры халодныя. Б'юць у стрэхі, у ваконьне, як-бы ад вякоў таёмная, страшная прырода хоча адняць ад людзей крышачку іх разуменьня: чаму? Схаваліся хаты—чорныя плямы—у моры сьнежных прастораў. А ў кожнай-жа хаце сэрцы людзкія, жыцьці людзкія. Пахаваны, запёрты... Сьнег... Сьнег... Замятае вёску. Налятаюць ветры халодныя. Ня сьпіцца Ганьне. Душна ў хаце. Хаваюць цяпло старанна ад холаду. А ў Ганны на сэрцы цяжка. Думкі яна думае. Пасвойму. Так як навучылася. Кахае яна Андрэйку. Моўчкі. Даўно. З тае пары, як ён гімназістам стаўся. Вось ён — расьсьмяяны, з блакітнымі вачыма — прыплывае да яе з шэрані ночы,стаіць, як жывы.

Прыемна-больна крывавіць сэрца. Мінула ўсё і ня вернецца. Вечар над рэчкаю. Калышыцца ў серабрыстай вадзе месячык. І чарот чарнее на блакітнай далі. А яны ціха сьняць... Няўжо ён любіць другую? Але, Андрэй заняты. Набраўся кніжнае мудрасьці, не даведаешся ў яго нічога. Слухае Ганна, як вецер гудзіць, як енчыць пад вокнамі, рассыпаецца сьмехам, сыпе сьнегам у шыбіны. І ня ведае Ганна, што ў вялікім месьце, дзе Андрэй, далёка, за соткамі вёрст, гарадзкі гадзіньнік б'е 10 гадзінаў.

Роўна—спакойна—разважна:

...Бам... бам...

Замятае сьнег вёску.

— Прыемна з табой, Андрэй... і чорныя вочы Вера зьлівае ў яго твар. Андрэй мацней сьціскае рукі. Пахіляюцца ўлева і ўправа целы. На асьвечанай коўзанцы іскрыцца лёд і плывуць сыльвэты людзей. Музыка разьлівае ў мускулах пеністы задор. А ў сэрцы—маладая радасьць. Узяўшыся за рукі, плывуць Андрэй і Вера па льдзістай гладзі. І, пахіляючыся, заглядаюць адзін другому ў вочы.

...Бам... бам...

Мароз зазьвінеў на асьнежаных галінах. Гасяцца вагні. На коўзанцы—малады крык. Пабеглі, пабеглі цені.

Андрэй адыйшоўся ад вёскі Набраўся кніжнае мудрасьці. У лябараторыі стаіць ён у белым хвартуху й пільна сочыць за шыпеньнем у прабірцы. Павясковаму цікаўіцца Андрэй. А воддаль халодныя вочы прафэсара зпад акуляраў узіраюцца на яго.— Будзе хімік! — думае прафэсар. Ён любіць Андрэя. Заманілі Андрэя вагні далёкага места. І пачула вёска, што першы іх вялікі чалавек — пайшоў кудысь і згінуў у далі. І ў Андрэя — таёмная барацьба. Схавана. укрыта глыбака, на дне душы. Заняты яго думкі паездкай да Веры. Чарнавокай. Гнуткай. Напеўнай. Неразгаданай... А над вёскай навісла хмарай цёмнай гора. Вось яно— у вачох хлопцаў, што скаваных павялі вясковай дарогай. І вечарамі смутак вясковы рассыпаецца ў гармоні па сьценах Грышкінымі пальцамі. А Андрэй глухі. Калісь сэрца кіпела, губы заціскаліся, вочы грозныя блішчэлі. А тады-ж ён быў гімназістым. Другі цяпер Андрэй, зьменены. Думкі яго кніжныя. А ў сэрцы— Вера — чарнавокая, гнуткая... Прайшлі няпрыметна ясныя дні Верыныя.

Каханьне Верына, як сонца яснае, як неба сьветлае, бяз хмар. На разьвітаньне паехалі далёка... саньмі. Дарога — белая палатніна, вышытая марозам. Іголачкі серабрыстыя... У ветры— словы—адрыўкі. Заехалі па дарозе ў хвальварак. Верына знаёмая. Хвоі і елкі спакойна спалі ў марозную ноч. Дарога незнаёмая ў ночы. Цёмна ў лесе. Правясьці клікнулі парабка, Рамана. Выйшаў Раман з ліхтаром У цемнаце ночы радасьцю кладзецца палаcа сьвету на белым сьнезе. Зазьвінелі спалохана шалястунчыкі.

Коньскія ногі правальваюцца скрозь сьнег. Андрэй з Верай у санках туляцца. А побач ходкія ногі выпераджаюць каня. Лапцюжныя ногі... Шыбка ступаюць, і не правальваюцца праз сьнег. Хутка, шпарка. Раз—два—раз—два..

— Раман! Асьцярожна.—Аглобля зачэпіць...

— Нічога... не зачэпіць.

— А ўсё-ж зыйдзі на бок, Раман. Раман зыходзіць на бок. Ліхтар у тахт калышыцца, а ногі шыбка ступаюць.

У небе зоркі мігатлівыя, вялікія. Далёка засталіся вагні хвальварку. Малелі, меншалі, як зорачкі, зачэпленыя сярод асьнежаных бяроз. І зьніклі.

— Раман! Вярніся! Неяк ужо заедзем.

— Я вас на дарогу... Блізка ўжо.

Зблудзіць лёгка...

Маўчаньне. Ногі ідуць і ідуць.

Андрэй глядзіць на іх і нейкая думка вырастае ў яго, мацнее, большае. І горыч захлынае гарачай хваляй... Вось яны... ногі, тыя, што вякамі церабілі гэтыя абшары, што пратапталі сьцежкі-дарожкі. А ён, Андрэй, едзе... Пан! Выплыла віна і заплюскала па берагі... Вёска каханая, непарушная, векавечная! Даруй! Яго каханьне такой агідай паказалася яму. І ўсе ласкі Верыныя. Пільна, як у прабірку ў лябараторыі, углядаецца Андрэй у рух вытрывальных ног.

На дарозе разьвіталіся. Андрэй вылез з саняў. Падзякаваў Раману. Раман зьдзіўлена паглядзеў на Андрэя. Стаялі. Доўга ўглядаліся, як мігацела сьвятло, замірала, хавалася за соснамі, то йзноў сьвяціла бледным, жоўтым пункцікам сярод сьнягоў.

Андрэй нічога не сказаў. Пайшоў па дарозе. Забражджэлі шалястуны.

— Андрэй! Куды?

Нічога ня чуваць...

Рвануліся коні. Пад'ехалі. Спыніліся.

—Андрэй! Андрэй! Надарвана крычыць Вера.

Завярнуліся коні. Цішэлі шалястуны і замоўклі нейдзе далёка. Хутка ідзе Андрэй. Сялянскім крокам.

— Раз—два—раз—два...

Да станцыі.

1934 г.

А. БЯРОЗКА.

*
* *

Сьнягі... сьнягі... сьнягі... І шэры дзень зімовы
Так доўга цягнецца... Аб нечым сэрца сьніць...
Маўчаць палі, панура лес маўчыць,
На думкі вольныя нуда кладзе аковы.

Лягла на полі бель... Нейк злосна вецер рвецца,
Мяце і круціць віхрам сьнежны пыл
І з над глухіх курганаў, з над магіл
Таёмны кліч са сьнегам ў даль нясецца...

Ён кліча тых, што гнуцца пад цяжарам
Жыцьцёвых мук, на вечны супакой —
І бледны цень з іржаваю касой
Бясслоўна цягнецца асьнежаным папарам...

Ня біся, сэрца!.. Гэта сьмерці цень...
Яго навёў зімовы шэры дзень...

*
* *

Туман разаслаўся над соннай зямлёю
І далі палёў пад туманамі сьпяць,
А цёмная ночка завесай густою
Паўзе праз папары, лугі, сенажаць...
Пушыстыя хмаркі па небе гуляюць,
Як стада авечак. Замоўклі лясы.
Задумаліс краскі: галоўкі схіляюць...
Рассыпаліс пэрламі кроплі расы.
Вось цені гусьцеюць на неба блакіце...
Бліснулі у вёсцы далёкай агні...
Ноч краскі цалуе і шэпча: „Засьніце!“ —
А краскі зямельцы шапочуць: „Засьні!“
А вецер свае карагоды заводзіць,
Галінкі бярозаў дрыжаць і шумяць,
І цёмная ночка да вёскі падходзіць —
Паўзе праз папары, лугі, сенажаць...

ГЭРМАН ВЯЛЕЦКІ.

Гэта было так нядаўна..

Гэта было так нядаўна—а разам
Дзіўнаю казкай дзіцячых гадоў,
Душу няволіла ясным экстазам
Шчасьце, прырода, любоў;
Гэта было так нядаўна—на хвалях
Ціхага возера лодкай плылі —
Дні у надзеях, у муках, у жалях
Дзесьці далёка былі.
Гэта было так нядаўна—над намі
Лес раськідаўся каронай густой,
І шапацелі дубы мне гальлямі
Ціхую казку—спакой.
Гэта было так нядаўна—ўсьміхалась
Сонейка яснае чарам паўдня,
Дробныя хмаркі плылі і здавалась
Сыпала ласкі зямля!
Гэта было так нядаўна—з прыродай,
З вобразам ясным душы маладой
Сэрца зьлівалась з такой асалодай,
Быццам казала—я твой!
Гэта было так нядаўна—наўкола
Радасьць, вясельле і шчасьце жыло,
Сэрца няўстрымана білась вясёла —
Гэта, здаецца... так даўна было!

З Усходняе Беларусі.

ПАЎЛЮК ТРУС *).

Ой, люблю...

У блакітнай высі, цёмна-сінім моры
Дагаралі зоры —
Зоры залатыя.
А ў ружовых далях, ой, з-за бору, бору...
Калыхала песьня паплавы—прасторы.

Калыхала песьня небасхіл імглісты,
Калыхала сьвістам
Пад гарою гай.
Ой, люблю сьпяваць я, на мяжы гарыстай
Дзе ў зары празрыстай
Топіцца імгла.

Калыхала песьня вольнае бязмежжа,
А ў грудзёх сярмяжных
Ой, вішнёвіць жар!
Эх,
Люблю я ў полі, на жытнёвых межах
Упівацца сьвежым,
Вінным сокам яру.

І тады на крыльлях вольна-сакаліных
Поглядам арліным
Мераю прасьцяг.
Дый люблю-ж я ў полі на прыпол даліны
Сыпаць цьвет малінны —
Новага жыцьця!... —

О, цябе я ўспомню, маладая вёска!...
Дзе ў вясновых ўсплёсках
Смутак утапіў,

*) Паўлюк Трус—адзін з найздальнейшых беларускіх поэтаў Усходняе Беларусі. Радзіўся ў 1904 г. ў Меншчыне, а памёр у 1929 г., будучы студэнтам Менскага Унівэрсытэту. Хоць памёр без пары, Трус пакінуў па сабе вялікі сьлед у нашай літаратуры. Творчасьць яго характэрызуюць глыбокі лірызм, сакавітасьць абразоў і вялікае багацьце й мілагучнасьць верша. З вялікай умеласьцю чэрпаў Трус з бел. народнай творчасьці. Яго стыль, які адзначаецца вялікім размахам і багацьцем тонаў, у значнай меры асновны на народнай песьні. Пісаў вершы й лірычныя поэмы, з якіх асабліва прыгожай ёсьць „Сірата Алеся". Выдаў некулькі зборнікаў сваіх вершаў, многа друкаваў у розных часапісах а ў 1931 г. Беларуская Акадэмія Навук выдала яго „Выбраныя вершы". Два першыя вершы і чацьверты Труса перадрукоўваем з яго зборніку „Вершы" з 1925 г., а трэці — з „Выбраных вершаў" з 1931 г. Рэдакцыя.

Дзе з касою вострай, раніцаю роснай
На мурог пракосах
Хмель я шклянкай піў.

У блакітнай высі, цёмна-сінім моры
Пагасалі зоры,
Зоры ды міганьні.
А ў ружовых далях, ой з-за лесу—бору...
Растапіла сонца мклівасьць сочна-раньнем.

У Купальскую ноч..

У купальскую ноч,
Над прасторамі вод
Цалаваліся явар з калінаю.
Як драмалі палі,
Засыпаў небазвод, —
Я спаткаўся з чароўнай дзяўчынаю.

Як драмалі палі,
А ў палёх ды туман,
Ох, туман малачай серабрысты,
Жыта—рунь паліваў
І кудзеліў твой стан, —
Мы ступалі далінай імглістаю.

А ў даліне, ў цішы
Зельле-кветкі цьвілі —
Ты вяночкі віла прамяністыя,
Залаціўся агнём
Золак раньні ў далі —
Як мінулі даліну імглістую.

І пашлі,
        і пашлі
Мы на вольны прасьцяг —
У прасторы палёў сінявокія.
Толькі сьпевы жніва,
Перазвоны жыцьця
Усплывалі
            далёка,
                    далёка.

Не разьвесісты гай
Гаманіў пад гарой,
Не зязюля ў гаі кукавала, —
У купальскую ноч,
Пры спатканьні з табой,
Ты аб шчасьці з запалам сьпявала.

Не на ўзмор'і чаўны...

Не на ўзмор'і чаўны
Ўдаль прастору вясны
Адплываюць і нікнуць ў тумане...—
Гэта постаці жней
Ў агняцьвеце надзей,
Ў строях зор шалясьцяць на майдане.

Ў іх руках васількі,
На прыполе вянкі
І смуглявая гордасьць ва ўсьмешках.
Яны кветкамі з руж
Асыпаюць зару,
Спавіваюць жыцьцёвыя сьцежкі...

І шасьцяць каласы
Ў пацалунках красы...
Б'юць паклоны ў часы непагоды...
Як маўкліва стаяць,
Думы ў сэрцы таяць, —
Думы-казкі адвечных мэлёдый...

А як песьня ў цішы
Ўскалыхне дно душы,
Паліюцца акорды... міноры...
Тады з больлю шыпшын
Вечна хочыцца жыць, —
Каб аддаць сваю радасьць прасторам...

О, як хочацца жыць, —
Абнімаць гэту шыр...
О, як хочацца сэрцам ўпівацца і думаць,
Каб у змроках далін,
Нат каменьні цьвілі, —
Каб ня згасьлі адвечныя думы...

А ў палёх каласы
Ў ціхім звоне красы
Б'юць паклоны абветраным нівам...
І як сон ў цішыні,
Як пражытыя дні,
Песьня коціцца ціха... маўкліва...

Ой, у полі паляначка,
Там гуляла дзяўчыначка
Ды сеяла руту-мяту...
Ды з возера ваду брала,
Руту-мяту палівала
Ў будны дзень і ў сьвята...

Ой, у полі палянaчка,
Там хадзіла дзяўчыначка,
Да сеяла з мятай ружы...
Расьці-ж, мая ружа-мята,
Цябе рваць будзе у сьвята
Мой міленькі дружа...

І пальлецца ў цішы
Песьня—водгук душы,
Песьня радасьці... смутку... і болю...
Дунай - жыта маўчыць,
Толькі плачуць сычы, —
Ў ціхой музыцы журыцца поле.

Ды як з мора чаўны,
На прасторы вясны,
Адплываюць і нікнуць ў тумане, —
Тонуць постаці жней
Ў агняцьвеце надзей, —
І шасьцяць—шалясьцяць на майдане.

Асеньняе.

Вёска, вёска —
Верасьнёвая прозалаць—кроў!..
Ну, аб чым ты сумуеш сягоньня?!
Майго сэрца журбою ня крой,
Яно—звон,
Павясноваму звоніць.

Ну, аб чым ты сумуеш?
Скажы!..
Ці шкадуеш, што вольныя ветры
Узрываюць быльнёг на мяжы
І нясуць яго ў цёмныя нетры?

Ці сумуеш, што ветры ў гаі,
Хіляць вербы да самага долу?..
Ой, ды смутку твайго не згаіць
У лісьцьве-жоўтацьвецені кволым.

Вёска, вёска —
Верасьнёвая прозалаць—кроў!
Ну, чаго ты замоўкла сягоньня?
Майго сэрца тугою ня крой!
Яно—звон,
Павясноваму звоніць.

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ *).

Радасьць.

Чалавек—гэта вір. Глыбокі і цёмны, дна якога ня ўбачыць. Ня ўбачыць і наогул таго, што дзеецца там, чым жыве таемная глыб гэтага віру.

Мы бачым паверхню яго, пералівы дзівосныя хваль – то буйных, віхурна-ўзьнятых, то дробных і кволых, як пераборы празрыстага ветрыку па струнах ціхае гарфы.

Мы бачым толькі паверхню, а ў глыб зазірнуць, пранікнуць туды, дзе таемным бяздоньнем зьвінулася цемра... О, каб пранікнуць туды! Каб разгарнуць гэты вір і ўбачыць усё, усё чыста, да самага дна...

Ябо сетку закінуць, каб выняць на сьвет хаця частку таго, што жыве ў таемным бяздоньні...

Мо'-б бліснулі сьвятлом нябачаным ясныя пэрлы?

Я мо' там—глей адзін, ціна, пясок?

Часам у пералівах хваль, што ськівамі рэжуць паверхню цёмнага віру, мы бачым адбітак насупленых хмар, душным цяжарам навіслых над намі Тады мы кажам:

— Гэта—Сум.

Я часам выблісьне сонца і хвалі заграюць вясёлкай, разарвуць, рассыпяць сонечны блеск у мільёны агнёў самацьветаў, расьсеюць навокал шчодраю жменяй іскры гарачыя. Тады мы кажам:

Гэта—Радасьць...

Сонца бывае рознае. То яно—палкае, шчырае — прынікае да самай зямлі, сьціскае яе ў сваіх моцных абнімках, цалуе смагла агнёвымі вуснамі. То атуляе нас, песьціць ціхай ласкавай цеплю, саграває нутро, навявае спакой. Я то дык зусім нейк дзіка, недарэчы выгляне з боку, з-за хмар—касавокае—і падражніць, пакпіць над дурным чалавекам.

Рознае сонца бывае.

І Радасьць бывае розная...

---

*) Міхась Зарэцкі (Косянкаў) — належыць да найздальнейшых маладых пісьменьнікаў Усходняе Беларусі. Выдаў шмат зборнікаў сваіх апавяданьняў і некулькі повесьцяў; з пасярод апошніх вялікай мастацкай вартасьцяй адзначаюцца „Сьцежкі-дарожкі“ 1927 г. і „Вязьмо“ 1932 г. Зарэцкі быў востра прасьледаваны бальшавіцкімі ўладамі за нацыянальна беларускі характар свае творчасьці. Паходзіць ён з Магілеўшчыны. Зарэц і ў галіне беларускай прозы выявіў вялікі талент і поўнасьцю апанаваў тэхніку сучаснае повесьці і новэлі. Яго апавяданьні і повесьці, густа пераплецены лірычнымі дыгрэсыямі і мастацкімі абразамі й эпізодамі, адзначаюцца выробленым харошым стылем і вялікім багацьцем поэтыцкае мовы. Япавяданьне Зарэцкага „Радасьць“ перадрукоўваем з яго зборніку „На чыгунцы“, Менск 1928 г.

Рэдакцыя.

* * *

Я сам сваймі вачмі бачыў той стол. Ён стаяў, неўзаметку прыткнуўшыся да вялізнае паліраванае шафы, у самым брудным кутку гарадзкога рынку. Шафа стаяла паважна й салідна—такая шырокая, тоўстая, як гандлярка з суседняга рундука. Здавалася—во-во падшмаргне падольле, схопіць пад пахі акольныя рэчы і паплыве па кірмашовай гразі.

А стол гэты ціхенька, м ўчком прытуліўся пад бокам у шафы і палахліва пазіраў на купцоў, не чакаючы ад іх нічога добрага. І праўда, калі хто й заўважыць яго, дык толькі штурхне пагардліва—і пашоў. Ён затрасецца на слабенькіх ножках, паенчыць і зноў прыхінецца да шафы.

Стол быў складаны: дошка на дзьве палавіны. Цяпер адна з палавін недалужна зьвісла далоў. Быццам сароміўся стол сваіх ног і схаваў іх ад людзкіх паглядаў.

Я колькі раз прайшоў каля гэтага стала і ня прымеціў, каб хто ўсур'ёз ім зацікавіўся. Я думаў ужо:

— Навошта лам'ё гэта вынесьлі? Хто яго купіць?

Але я памыліўся. Знайшліся куп цы.

Я не гандляр і ня маю гандлярскага спрыту. Але я адразу згадаў, што яны хочуць, усур'ёз хочуць купіць гэты стол. Яны ня спыніліся нават, прашлі міма — нібы-то што... Але-ж гэты позірк і потым гэты стрымлены крок, разважаньне, нясьмелыя рухі рукамі ў той бок, дзе стол... О, нас з гандляром не паддурыш!

Яны былі ўдвух: паджылая жанчына і хлапец гадоў дзесяць.

Уся худая фігура жанчыны, твар яе, рухі—усё працята было тэй застылай смутнай сур'ёзнасьцю, якую можа выснаваць толькі цяглае шматгадовае гора. Дый вопратка—досыць зірнуць толькі: рыжая падзьдзеўка — абшарпаная, з плямамі; спадніца, убога абвісшая; чаравікі... не чаравікі, а так нейкі дзіўны, недарэчны абутак,—мабыць апоркі, ці што... З усяго выглядае гарота.

А хлапец? Што-ж хлапец... У яго -цікавасьць У яго й вочы—дык як ня вырвуцца толькі: бегаюць, гараць.

Яны прайшлі разы са два яшчэ воддаль, потым пастаялі, адвярнуўшыся ў бок і тады падышлі ўжо к сталу.

Жанчына павярнула яго, паківала, а хлапец дошку падняў, зазірнуў. Потым яны пачалі таргавацца.

О, як таргавалася гэта жанчына! Яна надбаўляла толькі па дзесяць капеек і гандляра прымушала на столькі-ж збаўляць. Як яна ганіла стол! Колькі знаходзіла ў ім недахвату! Як спрачалася з гаспадаром, калі той яго бараніў!

А хлапец усё нікаў каля стала і то-ж заганы шукаў. Калі знаходзіў, ён з пачуцьцём вялікай пабеды паказваў на іх. І вочы яго гарэлі шчырым здаваленьнем.

Урэшце, яны старгаваліся і ўрачыста панясьлі свой здабытак праз рынак. Чуваць было, як яны ідучы, суцяшалі самі сябе, даводзілі адзін аднаму, што стол добры, што ён ня вельмі кі-

ваецца, што „тую ножку можна прыбіць", што наогул заган асаблівых няма—ня горш за іншага новага.

Я прагледзеў усю гэту сцэну. Мне неяк не па сабе стала, я расчуліўся. І маё сэрца радзіла мне казку. Я раскажу яе зараз.

Але ці казка гэта? Мо' гэта так і было? Мо' гэта ня казка, а праўда жыцьця?..

. . . .

Гэта была сям'я рабочага. Сям'я такая... Гаспадар — чарнарабочы, чалавек з вечна зморанным тварам, на якім жыцьцё пасеяла столькі маршчынак, колькі перацягнуў ён тачак цяжкіх, набітых пяском. У якога жонка — жанчына, працятая тэй застылай смутнай сур'ёзнасьцю, якую родзіць шматгадовае гора. І дзеці: дзяўчынка — трынаццаць гадоў, хлапец — гадоў дзесяць і другі—гады тры.

Жыла сям'я гэта ў убогай кватэры на акрайным брудным завулку. Кватэра ў іх у два пакоі. У вадным удоўж і ўпоперак ложкі—гэта спальня. А другі—заля, сталоўка і г. д. Тут і мэбля стаіць, гэта значыць: шафа, стол і чатыры крэслы.

Гэты другі пакой шмат гадоў быў галоўным цэнтрам сямейнага жыцьця. І праз увесь гэты час у ім быў пусты адзін кут. Недарэчна, дзіка пусты. Пусты—бо не ставала мэблі, каб запоўніць яго.

Гэты кут сваёй пустатой халадзіў увесь пакой, быццам глытаў бяздонным зевам сваім прыветлую цепль сямейнага шчасьця. Ён не даваў зьвіцца ў сям'і радаснай, ціхай прытульнасьці. Ён напамінаў, крычаў злорадасна аб бядоце, аб цяжкіх нягодах жыцьця. Ён—страшэнна, жорстка пусты — уліваў пустату і ў жыцьцё гэтай сям'і.

Бывала так: зьбярэцца сям'я ўся, адпачывае. Ціхамірная згода гатова акутаць усіх сваім лёгкім крылом. Во-во ўжо, здаецца, прыдзе і цёпла зайскрыцца ў пакоі радасьць.

Але зірне каторы ў пусты халодны куток і ўспомніць. І пяройдзе да ўсіх, і пратне ўсіх жорсткім павевам скразьнік няпрытульнасьці, злосна выштурхне радасьць з пакою.

Во як бывала...

І вось, урэшце, у сям'ю беднага рабочага прышла радасьць. Яна ўвайшла ў хату разам з сталом, што прыцягнулі з рынку матка і сын. Яна зусім відочна, прыметна ўвайшла, як нейкая жывая істота.

Яе першая стрэла дзяўчынка-дачка.

Дзяўчынка ў трынаццаць гадоў... Як можна апісаць яе радасьць? Ці ёсьць словы такія—жывыя, агнёвыя, — якімі-б выказаць гэта? Ці мо' апісаць выяўленьне надворнае гэтае радасьці? Мо' расказаць, як скакала яна, як пляскала ў ладкі? Мо, расказаць пра блеск яе вочак—чыстых, як у крыніцы вада?..

Не, лепей во што...

Яна пацалавала свайго мурзатага брата. Той пачаў быў яе сунімаць, усьцішаць. Бо ён-жа сур'ёзны зусім, ён з мамкай сам купляў гэты стол, у яго й шапка аблезлая на самыя вочы важна насунута. А яна тады абхапіла яго і пацалавала.

Сястра пацалавала брата. Сястра — брата... Ну, годзе, здаецца?...

Дык во як стрэла дзяўчынка радасьць.

Гэта было ўжо шэрай гадзінай. Неўзабаве прышоў гаспадар. Запалілі сьвятло, пілі чай. Пілі, вядома, за новым сталом, хоць і нязручна было. Гаманілі, сьмяяліся. Дзеці дурэлі. Словам, было так, як заўсёды бывае, калі ў госьці прыходзіць радасьць.

А потым прачнуўся малы. Заплакаў, заенчыў у спальні — так жаласна, квола. Ён хворы, ён заўсёды плача, як прачынаецца.

Дзяўчынка пабегла, прыцягнула яго.

— Ціху, дзетка... ціху, ну... Глянь, вунь стол... Паглядзі!...

У дзіцяці на твары застыла плаксівая міна. Часінку моўчкі глядзеў, плюскаў ад сьвету вачмі. Потым ажывіўся, матнуў парыўчата ручкамі.

— Стол, стол... Тата, гэта стол. . Вунь ён...

І худзенькі тварык яго, яшчэ мокры ад сьлёз, сагрэўся любай чыстай усьмешкай.

Хацу на стол... сесьці хацу...

І яго пасадзілі. Рассунулі шклянкі і сярод іх пасадзілі. Сёньня-ж можна, сёньня тут радасьць, а радасьць—апека дзяцей. Ён сядзеў на стале шчасьлівы, здаволены,—ваяваў пабедна рукамі і гвалтаваў бесьперастанку:

— Стол, стол... гэта—стол...

Як скончылі чай, ня ўсталі з-за стала. Сядзелі ўсё, гаманілі, сьмяяліся. Была радасьць, была прытульнасьць і ціхае шчасьце.

А пасьля і зусім разышліся. Пачаў гаспадар. Ён выцер распараны твар, вальготна адкінуўся на сьпінку крэсла і зацягнуў грубым расшчэпленым голасам, рыпучым, як заржавелы блёк...

Дзеці ўраз падтрымалі яго. А тады і гаспадыня не ўцярпела: замылілася соладка і падвяла тоненькім-тоненькім галасочкам:

...У бары зязюля
Кукуе,
Ніхто зязюлі
Ня чуе...

І было так цёпла, так сьветла...

. . . .

Бывае часамі, што сонца атуляе нас, песьціць ціхай ласкавай цеплю, саграе нутро, навявае ціхі спакой...

Бывае сонца такое..

І такая Радасьць бывае...

Я. ШУТОВІЧ.

Адам Гурыновіч.

(1869 г. — 14.I. 1894 г.).

Адным з многіх талентаў, якіх жорсткі і бязьлітасны лёс забраў нам у цьвеце веку, зьяўляецца Адам Гурыновіч. Аб ім мала ведаем. А што ведаем—ёсьць наўперад заслугай і добрым сьвядоцтвам вялікай культуры сваякоў ягоных, што сяньня яшчэ жывуць.

Проф. Браніслаў Тарашкевіч, у артыкуле сваім аб Адаме Гурыновічу, *) падае скромныя аб ім весткі, як біографічныя так і тыя, што адносяцца да творчасьці ягонай арыгінальнай і перакладнай, а так-жа ягонай дзейнасьці ў кірунку зьбіраньня беларускага этнографічнага матар'ялу.

У мінулым годзе, дзеля ўшанаваньня памяці Адама Гурыновіча, з увагі на 40 ўгодкі ягонай сьмерці, я даў артыкул аб юбіляце **).

Адам Гурыновіч.

І дзеля гэтага лічу лішнім паўтараць тое, што сказана аб ім у гэных артыкулах (асабліва бліжэйшыя дадзеныя біографічныя).

А. Гурыновіч браў дзейнае ўчасьце ў рэволюцыйна-народніцкім руху 90-х гадоў XIX веку і як поэт шмат напісаў рэволюцыйных вершаў. Аб грамадзкай і рэволюцыйнай ягонай дзейнасьці, атак жа аб ягонай працы, як этнографа, гаварыць тут ня буду. Скажу тут аб ягонай літаратурнай творчасьці (арыгінальнай і перакладнай). Апіраюся пры гэтым на ягоных рукапісах ***). А гэта-ж невялічкая частка Гурыновіча. Большая частка і найвартасьнейшая, пераважна пабеларуску пісаная, нажаль зьні-

*) Глядзі „Беларускі Звон" № 3, Вільня, 1921 г.

**) „ „Беларуская Крыніца" № 12, Вільня, 1934 г. і „Шлях Моладзі" № 3 (63), Вільня, 1934 г.

***) Рукапісы, у беларускай мове пісаныя, узяў я дзеля выкарыстаньня з Беларускага музэю ім Ів. Луцкевіча ў Вільні; пералічэньне твораў падана ў артыкулах вышэй прыточаных часапісаў. Некаторыя з іх, дагэтуль нядрукаваныя, падаю пасьля гэтага артыкулу.

стожана ў сувязі з трасеньнем, прасьледам і арыштам царскімі ўладамі Гурыновіча, як рэволюцыянэра *).

Адам Гурыновіч пісаў пабеларуску, вершам і прозай, папольску і парасейку і перакладаў на беларускую мову польскіх, расейскіх і ўкраінскіх аўтараў, перакладаў поэзію і прозу. У перапісцы (польскай) падпісываўся Ежы (Юрка).

Беларускі нацыянальны твар поэты і агулам нацыянальны элемэнт добра выражаны наўперад у вершах наступных: „Да Мацея Бурачка“, „Што ты сьпіш мужычок“, „Што за звук ды так громка раздаўся“ **).

З першага відаць, які ўплыў на поэта меў Францішак Багушэвіч. Поэт кажа:

„Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею,
За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею,
Што між братоў нашых знаходзяцца людзі
З кахаючым сэрцам і баляшчай грудзяй.
Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,
Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы,
Бяры, браце, дудку, наладзь і жалейку,
Няхай песьнь смутная ідзе у калейку
І будзіць у сэрцах мысьль аб лепшай долі,
Якой мы ня зналі дагэтуль ніколі“.

У вершы „Што ты сьпіш мужычок“, нагадываючы верш — пад такім-жа загалоўкам—расейскага поэты Кальцова, А. Гурыновіч, будзячы беларускі народ ад вяковай сьпячкі, вуснамі мужыкоў гавора аб іх соцыяльным і нацыянальным палажэньні, будзіць у іх пачуцьцё годнасьці людзкой, гавора аб іхных соцыяльных ворагах—панох, і аб цару, які нібы абдараваўшы мужыкоў воляй,—пакінуў іх далей у соцыяльнай і нацыянальнай бядзе:

...„Бо хоць волю нам даў—
Розуму ні крошкі,
Ісьці жыць прыказаў
Ня відзя дарожкі,
Хаця скрось настаўляў
Вучылішч, гдзе вёска
„Букі-ас“ —наказаў
Навучаць бярозкай;
А раднога слаўца
Ніхто і ня чуіць,
Толькі так малайца
Саўсім ён сапсуіць
Ды навучыць рабя
Лаіцца паруску:
„С... сын я тебя
Засаджу ў кутузку“.
„С.... сын“ ці „пся маць“
Абое-рабое,
Ці-ж ня могуць нам даць
Што кольвек другое?“

А ў вершы „Што за звук ды так громка раздаўся“—кажа Гурыновіч, што „звук“—гэта стогн, і

*) Арыштаваны ў 1893 г. у Вільні, у ўласным на той час будынку Гурыновічаў, пры вул. Пірамонт № 22. Так цьвердзяць сваякі Адама, названыя ў артыкуле Тарашкевіча і маім.

**) Тры гэтыя вершы, а такжа „Ох, ох умру ад сьмеху“ і пераклады з Каспровіча („Вясна“), Міцкевіча („Вяльля“) надрукаваныя ў „Бел. Звоне“, Вільня, 1921 г.

„...гэты стогн быць ня можа,
Каб з грудзі ён выходз ў аднэй, —
То ўвесь **наш народ** гэтак стогне
Над няшчаснаю доляй сваей".

А народ стогне дзякуючы таму, што:

....„Ёсьць і рукі і шчырай ахвоты
Нам ня бракла да працы ніколі,
Але негдзе найсьці нам работы —
Ох, ня будзе нам хлеба, ні солі.
Мал надзел ад дзядоў нам астаўся,
Разьдзялілі сыны і яго,
А цяпер—глянь—як вузенек стаўся:
Два шагі тут уішыр усяго".

Творчасьць Гурыновіча агулам пранікнута грамадзкім зьместам. Соцыяльны і нацыянальны элемэнты грунтоўныя, яны пераважаюць. У вышэй цытаваных вершах Гурыновіч прадставіўся, як мужыцкі сялянскі поэт, закрануў у іх істотныя балячкі соцыяльнага („ня будзе нам хлеба, ні солі", „негдзе найсьці... работы",) і нацыянальнага (няма „раднога слаўца", роднай школы), жыцьця.

Па духу, па ідэолёгіі творчасьць А. Гурыновіча нацыянальная, і гэты элемэнт зьяўляецца і народным элемэнтам.

Адным з грунтоўных элемэнтаў, як сказана вышэй, ёсьць элемэнт соцыяльны, аднак у Гурыновіча ён не пераходзіць у партыйна-соцыялістычны кірунак.

Мова беларуская твораў Гурыновіча — часта поўная русыцызмаў і полёнізмаў, хоць у некаторых (напр: у ніжэй друкаваных) чысьціня мовы ў вялікай меры захаваная.

На аснове тых беларускіх твораў, якія мы пад рукой маем —можна сказаць, што творы Гурыновіча—ня так ужо далёкія ад твораў прыгожага пісьменства.

Маральнае значэньне твораў Гурыновіча—вялікае. Ён выказаў у іх чалавечае і грамадзянскае абурэньне проціў зьдзекаў з боку соцыяльных, нацыянальных, і палітычных ворагаў народу, ня раз ужываючы сільных і вострых слоў (у вершах „Што ты сьпіш мужычок", „Перш душылі паны, што шляхтай зваліся"), ён зьвярнуўся у сваіх творах да нізоў, да слаёў грамадзкіх, найбольш пакрыўджаных; даваў яркія антытэзы соцыяльныя („З гадоў голаду" Арэшчыхі—пераклад, „Вечны рэволюцыянэр-дух" з Янука Пранко і ў іншых), даваў у творах тое, што магло народ бараніць і будзіць да лепшага жыцьця.

Любіў праўду і грамадзкую справядлівасьць і праводзіў іх, як поэт, у творчасьці сваей, ведаючы аб тым, што творчасьць—ня толькі павінна служыць самому хараству — мастацтву, але і ідэалам этычным, грамадзкім, нацыянальным, палітычным і інш. У гэтым веліч і актуальнасьць Гурыновіча.

Калі з гледзішча вымогаў літаратуры, як мастацтва, глядзець на творчасьць Гурыновіча, то яна мае значэньне ня лішняе, але з гледзішча постулятаў этычна-грамадзкіх яна мае значэньне вялікае і актуальнае.

Так выглядае А. Гурыновіч у сваей працы на літаратурным прасторы беларускім.

З недрукаванай спадчыны Адама Гурыновіча

(Вершы падаём з усімі асаблівасьцямі мовы поэты.— Я. Ш.).

Зцямнела на дворы і ціха кругом;
Казельчыкі толькі ў мураўцэ крычаць
І з далеку нейдзе, не накш за лугом,
Вясковых начлежнікаў гоман чуваць...
Цяпленькая ночка ціхонька сышла
І цёмнай пасьцілкай прыкрыла усіх:
І з шопатам ціхім над сьветам лягла
Ка сну калыхаці і добрых й благіх.
У хату увойдзіць, у прывен глядзіць:
Ці сьпіць гаспадыня, ці дзеткі ляжаць?
Ці сам гаспадар на палацях храпіць,
Ці гдзе непарадкаў якіх ня відаць?
Усюды спакойна і людзі ўсе сьпяць,
Прыкрыўшыся цёмнай пасьцілкаю ночы.
Аднаму мне толькі ня можна прызваць
Спакойнага сону; а мысьль лятучы
Маланкай праходзіць праз голаву мне
І тысячу думак адна за аднэй
Ляцяць быдтам птушкі; і ў сэрцы на дне
Становіцса цяжка. Цясьней і гарчэй
Здаецса на сьвеце на гэтым жыцьцё.
Ох, думкі! каханкі і каты мае!
Куды ад вас дзецса? і што вы дасьцё,
Каб сэрца ня стогла, каб мысьлі свае
Глыбока, глыбока ў грудзі захаваць,
І песьняй вясёлай усё заглушыць.
Ох дарма! ня можыця даць
Вы мне спакайносьці... А месяц блішчыць
Па сіняму небу йдучы. Паляджу
На ціхую ночку, на цёмнінькі лес
Лягчэй можа станіць, як там пахаджу
І смутак загініць, што ў душу залез.
І з гэткаю мовай на двор выхаджу.
Іду каля тыну... *).

---

*) Працягу гэтага верша ў рукапісах у сябе ня маем.

БОР.

Ох ты, бор, мой бор,
Бор сасновенькі!
Ты з каторых пор
Шуміш родненькі?
Мы з табой расьлі
Уздымаліся,
На аднэй зямлі
Гадаваліся.
Мы зжылісь з табой,
Бор наш родненькі,
Як з сваей сумой
Жабрак голенькі.
А з табой у нас
Долі роўныя;
Мы з табой якраз
Браты родныя.
Ні ў нас долі нет,
Ні ў нас шчасьцінька;
Апастыў нам сьвет,
Зямля матынька.
У другіх людзей
Зямля лепшая,
Там і жыць лягчэй,
— Праца меншая.

У пяску сваім
Мы кулаімся,
Ня ў прымер другім
Прабіваімся,
Па лясох другіх
Усё лепшая;
І ліства на іх
Ўсё страйнейшая.
У бару-ж шумяць
— Сосны-ёлачкі;
На сучкох тарчаць
Ўсё іголачкі.
А ў нашых людзёх
Ўсё сярмяжачкі
А ў іх кешанёх
Ні бумажачкі.
А і будзім ждаць
Часу добрага
Ды нуж выглядаць —
Што ёсь новага.
Ды ня будзіць-ж так
Векі вечныя.
А прыдуць ніяк
Часы лепшыя.

Вясна.

Ты узноў да нас вярнулась,
Бледнай восені сястрыца!
Белай сукняй апранулась.
Ты румяна, сьветлаліца!
Ды, адкуль прышла мілая?
Гдзе жыла,—была далёка?
Мы це ждалі дарагая,
Выглядалі смутным вокам.
Зналі мы, што ты вярнешся,
Край ня кінеш нешчасьлівы;
Залатым лучом пральешся
На паля, лугі і нівы.
І лучом тваім цяпленькім
Аджыла узноў зямліца.
Зацьвіцеў цьвяток красьненькі
Запеяла ў лузе пціца.

Скора ластаўкі гнязьдзечкі
Пад страхой начнуць зьвіваці,
І бацян зьляціць да рэчкі,
Рожных гадаў там іскаці.
Скора ў поля з песьняй звонкай
Артае пайдуць араці,
І пад песьню жаваронка
Прасіць стануць Божай Маці:
Каб жытцо было буйноя,
Сенаваць каб пры пагодзе,
Каб ўрадзіла не благоя
Ўсё у полі і гародзе.
А як зьберым усё з поля —
У гумно ў тарпу паложым,
Дык памолімся ў касьцеле
І табе ахвяру зложым.

Да жніва.

— А пайду-ж я, маці,
Ў поля жыта жаці!
Жыта зелянеіць,
Колас наліваіць;
Вецяр з ніўкі веіць—
Жнеяк прызываіць:
— Ды ўставайця, жнейкі,
Дзеўкі маладзенькі!
Ды скарэй вастрыця
Ржавыя сярпочкі,
Ды бардзей пачніця
Вузенькі шнурочкі.
Бо пачну гуляці,
Ніўку калыхаці:
— Досыць табе, ніўка,
Ў полі красавацса;
Пара табе, ніўка,
У гумно схавацса!
— Ціха-ж, вецер, ціха!
Не рабі-ж ты ліха.
Плачыць ніўка, плачыць
Гнецса каласамі;
Ня відзіць—не бачыць
Жнеячык з сярпамі,
— Ой! і гдзе-ж вы, жнейкі.
Дзеўкі, маладзенькі.
Вецяр каласэнькі
Хочыць вытрасаці;
Зерняткі паўненькі
Ў зямлю пакідаці.
— Ціха-ж, ніўка, ціха
Не рабі-ж нам ліха.
Рукі ўжо памлелі
Граблямі махаці,
Яшчо-ж не пасьпелі
Сена паграбаці.
Пажджы-ж, ніўка, трошка
Справімся нямножка.
Сянцо дазьбіраім
І дамоў пазвозім:
Ў тарпу наскладаім—
Тады сярпы возьмім.

* * *

Перш душылі паны,
Што шляхтай зваліся
Цяпер с.... сыны
За нас узяліся.
Ані той, ані сёй
Не далі нічога
Нашу-ж працу у свой
Кяшэнь пакавалі,
Ды ці доўга-ж нам ждаць
З рукі іхняй ласкі,
І штораз спагадаць
Усім думкам паньскім.
Няхай хлопцы усе
Зьбіраюцса кучай
У таком хаўрусе
Станімся мы тучай,
Што дожджыку дась
У нашай злой долі,
Дух падойміць у нас,
Як рунь у тым полі.
А з тэй тучы, як гром
Сярод летняй ночы
Загручыць ўсім паном
Загуба у вочы.

Каток.

Сядзіць над вадою маленькі каток,
Глядзіць ён на рыбкі—разінуў роток,
Хацеў-бы дастаць іх, баіцса скікнуць,
Баіцса вадою ён ног абмакнуць.

А й хлопчык маленькі над ксёнжкай сядзіць,
Яе ён раскрыўшы на вершы глядзіць.
І рад-бы учыцса—хацеў-бы ўсё знаць,
Дык шкода галоўкі сваей бедаваць.

Ах! дарма мой хлопчык, напрасна дзіця, —
Пячоныя пташкі у рот ня лецяць.
Калі ты штокольвек захочыш пазнаць,
То мусіш ня мала над тым працаваць.

Рыбак.

Стаіць рыбак над вадою
Ловіць рыбіну вудою:
Стаяў, стаяў ён дзень цэлы —
Ані рыбкі ня прысьпела.
Скора сонца за лес сядзіць,
Аж за вудку нехта цягніць.
Учапіўся карась нейкі:
Такі дрэньнінькі, маленькі;
Рыбаку ён стаў казаці:
„Мяне варта адвязаці
І выпусьціць, зьняўшы з вуды:
Бо ці-ж варта вастрыць зубы
На маленькую такую,
Як я, рыбіну худую.
Пусьці ў раку—раздабрэю
Год, ці два—як раз прысьпею;
Як вырасту—смачны буду,
Учаплюся сам на вуду“.
Добра, добра, рыбак скажыць,
І той дурны, хто так кажыць
Ды на заўтра адкладаіць
І што маіць—то кідаіць:
Па мне, розуму не маіць
Хто злавіўшы—з рук пускаіць.

АД. СТАНКЕВІЧ.

„Mužyckaja Prauda“ і „Гомон“.

Сынтэтычны нарыс.

У мінулым 1934 г. прайшло 70 гадоў ад сьмерці слаўнага барацьбіта за вызваленьне зямель быўшага Вял. Кн. Літоўскага з пад маскоўскага панаваньня, Кастуся Каліноўскага, з імем якога зьвязачы першы ў беларускай мове рэвалюцыйна-вызвольны часапіс „Mužyckaja Prauda“. У тым-жа мінулым годзе споўнілася 50 гадоў ад часу паяўленьня, хоць пісанага па расейску, але зьместам беларускага, так-жа палітычна-вызвольнага часапісу „Гомон“. З гэтай нагоды часапісам гэным і пасьвячаю гэты кароткі, сынтэтычны нарыс свой.

Абодва гэныя часапісы—гэта першыя ластаўкі беларускага палітычнага вызваленьня. Але не паявіліся яны на беларускім небасхіле ні з сяго, ні з таго — зрадзіў іх дух часу, імкненьні і ідэалы, якія ў той час панавалі ў Эўропе. Цёплы, поўны жыцьцёвай радасьці і творчых сьвежых сіл, романтызм, які паявіўся ў канцы XVIII і ў пач. XIX ст., замяніўшы суровы і акасьцянелы клясыцызм, у прыгожым пісьменстве і ў некаторых галінах навукі, узбудзіў новыя літаратурныя і навуковыя творы, будзячыхся да нацыянальнага жыцьця народаў. У тым-жа часе, апрача романтызму ў літаратуры і навуцы, паявіўся ў Зах. Эўропе і романтызм народна палітычны, які, замест песьняў аб красе і нядолі жыцьця народаў, замест навуковых досьледаў над гісторыяй і мовай народаў, радзіў барацьбу за лепшае, вольнае палітычнае і соцыяльнае жыцьцё іх. Вялікая Француская Рэвалюцыя, наполеонаўскія войны, нацыянальна-вызвольныя рэвалюцыі многіх паднявольных народаў у Эўропе ў першай палове XIX ст. народна-вызвольныя ідэалы гэныя разьнесьлі па ўсім сьвеце, а ўрэшце — спярша праз Віленскі ўнівэрсытэт, а пасьля праз унівэрсытэты расейскія, данесьлі і да Беларусі. „Mužyckaja Prauda“ і „Гомон“ зьяўляюцца роднымі дзецьмі гэных романтычна-палітычных ідэалаў.

Беларускія адраджэнска-вызвольныя імкненьні шчыльна зьвязаны з тэй грамадзкай клясай, на якой беларускае культурнае і палітычнае самастойнае жыцьцё замёрла. Фармальна палітычная самастойнасьць нашага народу перастала існаваць на Люблінскай Уніі, а фактычна значна пазьней, бо аж да канца XVIII ст. Беларусь і Літва яшчэ шмат мелі палітычных і іншых правоў, якіх яны стойка баранілі.

Апошнім, сапраўды дастойным абаронцам астаткаў палітычнай і культурнай асобнасьці нашага народу і ўсіх беларуска-літоўскіх зямель быў слаўны Канцлер Вял. Кн. Літ. вялікі Леў Сапега. Беларускія магнаты, як пануючая і кіруючая кляса ў народзе, былі апошнімі абаронцамі палітычных правоў беларускага народу. Першымі пачынальнікамі палітычнага адраджэньня

гэтага народу былі ўжо прадстаўнікі дробнай шляхты, як клясы ўсё-ж дыкі асьвечанай і вольнай, няпрыгоннай, пры тым абяднелай і гэтым зблiжанай да народу. Гэтая дробная і абяднелая, аканчальна не апалячаная беларуская шляхта, была адзінай свайго роду інтэлігентнай клясай у нашым народзе, якая зьберагла памяць аб яго мінуўшчыне і аб яго нацыянальнай асобнасьці і пры нагодзе ўзноў стала на чале гэтага народу. Гэткім быў К. Каліноўскі і многія з тых людзей, пры пасрэдніцтве якіх нарадзілася „Mužyckaja Prauda“.

* * *

Часапіс — ці лепш зародак часапісу — „Mužyckaja Prauda“ пачала выходзіць у Горадзеншчыне, праўдападобна ў Беластоку, у 1862 г. Друкаваная яна лацінкай, на двух бачынах аднаго лістка, разьмерам васьмёркі, у беларускай мове, з асаблівасьцямі Горадзеншчыны, з невялічкай дамешкай полёнізмаў. Крыху большым фарматам розьніцца ад іншых нумар сёмы. Наперадзе „Mužyckaj Praudy“ азначаны парадкавы нумар, а ў канцы цана: „hrošy 5“. Усе нумары падпісаны мянюшкай — Jaśko haspadar z pad Wilni. Усіх дагэтуль ведамых нумароў вышла сем. З ведамых дагэтуль літаратурных крыніц вынікае, што пад успомненай мянюшкай крыецца слаўны паўстанец, дыктатар Літвы, Кастусь Каліноўскі.

Галоўная палітычна-грамадзкая мэта „Muž. Pr.“, да якой яна заклікае беларускіх сялян, гэта: пазбыцца расейскага цара, пазбыцца паноў і паншчыны, здабыць для сялян зямлю на ўласнасьць, не плаціць вялікіх і крыўдных падаткаў, служыць у краёвым войску і ваяваць толькі за волю свайго краю, калі хто на яго нападзе, мець вольнасьць трымацца тэй веры, якой трымаліся прэдкі народу і быць вольнымі людзьмі, як гэта было ўжо ў многіх, а ў многіх заводзілася, дэмократычных дзяржавахЭўропы.

„Muž. Pr.“ заклікае беларускіх сялян да паўстаньня разам з палякамі проціў расейскага цара і проціў польскіх паноў. Палітычным сваім зьместам яна такім чынам адгараджваецца ад Расеі, як такой, з Польшчай-жа не зрывае, а зрывае толькі з панскай, пануючай клясай

Мэта беларускага ўчасьця ў польскім паўстаньні — здабыць вольнае і шчасьлівае жыцьцё, вольнае ад паншчыны і вольнае ад палітычнага польска-дзяржаўнага цэнтралізму.

У часапісе гэтым, праўда, не спатыкаем ані разу слоў: Беларусь, беларускі народ. Гаворыцца там толькі аб „нашым народзе“ агулам, гаворыцца аб „мужыкох“, аб „мужыцкай долі“, аб „мужыцкім народзе“, аб „нашым краі“. Але край гэты і народ ягоны хоць дужа агульна, дужа асьцярожна, разважаецца як нешта асобнае і рознае ад Польшчы і палякоў. Заклікае гэты часапіс беларускіх сялян да паўстаньня разам з Польшчай, але з тэй, якая ідзе за „мужыкоў“ і якая гварантуе вольнасьць беларускаму народу і краю.

Ілюстрацыяй палітычнага і грамадзкага характару „Muž. Pr." няхай паслужаць вось гэтыя з яе выбаркі „O, zahrymić naša prauda i jak małanka pralacić pa świecie"... „Ad maskala i panou niema czeho spadziawacisia, bo jany nie wolnaści a hłumu i zdzierstwa naszeho choczuć... No niedouha jany nas buduć abdziraci, bo my paznali hdzie siła i prauda i budziem wiedać jak rabić treba, kab dastać ziamlu i wolu" (№ 1), „Kab narod nasz na wiek wiekau byu wolny i szczaśliwy" (№ 2).

„Czaławiek wolny, kali maje kusok swajej ziamli, za katoru ani czynszu i abroku nie płacić, ani panszczyny nia służyć"...

„Nam wolnaści treba nie takoj, jakuju nam car schocza daci, no jakuju my sami mužyki pamież saboju zrobimo... Niama czaho ždaci ad niekaha, bo toj tolki žnie, chto pasieje" (№ 3).

„U nas adno wuczać pa szkołach, kab ty znau czytaci pa maskousku, a to dla taho, kab ciabie sausim pierarabili na maskala (№ 4).

...„Pad maskalom zabyci treba, szto jość u nas nasza baćkaŭszczyna" (№ 5).

...„U Polszczy mužyki taksama, jak i wy spadziejališ na cara"...

...„Pamoh-by i nam Prancuz, jak pamahaje mužykom u Polszczy, ale mužyki mauczać, a car kaža, szto jany dawolny...

„Nia tak dumali mužyki u Polszczy"...

Stańmo družna razom za naszu wolnaść, jakoj nia było naszym dziedam i baćkam" (№ 7).

Беларускі народніцкі характар „Muž. Pr." пацьвярджае так-жа і факт адносінаў яе да рэлігіі. Яна (№ 6) горача выступае ў абароне уніі. І гэта зразумела. Праваслаўе было тады, як і цяпер, аружжам маскоўшчыны, а лацінскае каталіцтва аружжам польскасьці. Адно й другое было сымболем народнага ўціску. Унія-ж наадварот: гэта была фактычна мужыцкая народная вера, пагарджаная пануючымі, як і сам „мужык" беларускі.

Словам, „Muž. Pr." гэта тыповы беларускі пачаткава-народніцкі часапіс. Праўда, у ім яшчэ пануюць традыцыі Вял. Кн. Літоўскага, але праз гэныя традыцыі, асабліва на тле часу яго выхаду ў сьвет, відацца ўжо зародкі новых беларускіх вызвольна-нацыянальных ідэяў. „Muž. Pr." гэта прадвесьніца і пачынальніца палітычна-соцыяльнага вызваленьня беларускага народу, як складовай часткі ўсебаковага нацыянальнага адраджэньня ягонага, гэта ранішняя зорка на беларускім небасхіле, якая азнаймляе беларускаму народу ўсход сонца і будзіць гэты народ да долі і волі.

* * *

Думка беларускага палітычна-соцыяльнага вызваленьня, засеяна „Muž. Praudaj", марна не прапала, а жыла і разьвівалася далей. На дваццаць другім годзе пасьля выхаду яе ў сьвет, паявіўся новы беларускі палітычны часапіс „Гомон". Часапіс гэты сапраўды ёсьць прадаўжэньнем „Muž. Pr." і яе дапаўненьнем.

„Гомон“ быў органам беларускіх народнікаў-рэволюцыянэраў, меўшых сваю сэкцыю пры расейскай „Народнай Волі“, сярод якіх бадай галоўную роль іграў слаўны Ігнат Грынявецкі, згінуўшы ад бомбы, якую кінуў у цара Аляксандра II у 1881 г. Часапіс гэты вышаў на трэцім-чацьвертым годзе па сьмерці Грынявецкага.

Выдаваўся „Гомон“ шапірографскім спосабам, у расейскай мове, фармату больш-менш нормальнага сшытка. Дзе выходзіў—напэўна няведама. Можна дагадвацца, што ў Пецярбурзе, дзе быў галоўны цэнтр беларускай студэнскай рэволюцыйна-народніцкай моладзі.

Усіх нумароў „Гомону“ было толькі два. Ведамым ёсьць толькі № 2, з датай 15 лістапада 1884 г. Аб нумары першым, што ён быў вышаўшы, успамінаецца ў № 2. Ці ён аднак гдзе захаваўся—няведама.

Адзін арыгінальны экзэмпляр „Гомону“ нумару другога і так-жа адзін экзэмпляр копіі з яго, — якой я карыстаўся для гэтых нарысаў,—знаходзіцца ў Беларускім Музэі ў Вільні.

„Гомон“ складаецца з наступных артыкулаў: Бѣлорусское революціонное обозрѣніе, Внутреннее обозрѣніе, Корреспонденціи і з артыкулу неазагалоўленага аб нацыянальнай праблеме.

Ідэовы зьмест „Гомону“, вылажаны цалком выразна ў артыкуле першым і апошнім—гэта барацьба за палітычную і эканамічную самастойнасьць Беларусі ў агульна-расейскай фэдэрацыі.

Першы артыкул, абгаварыўшы тактыку барацьбы беларускіх народавольцаў і іх адносіны да расейскай „Народнай Волі“ і труднасьці, якія яны ў сваіх пачынаньнях напатыкаюць, канчаецца гэтак: „Но как-бы не велики были эти трудности, мы, поскольку это будет в наших силах, положим первый камень для фундамента федеративной самостоятельности Бѣлоруссіи“...

Беларускія народавольцы, як гэта відаць з „Гомону“, з боку многіх расейцаў напатыкалі нямала перашкод і сумніваў у вартасьць іх працы. Ужо тады яны нашых барацьбітоў за Беларусь страшылі нацыяналізмам і сэпаратызмам. Вось-жа артыкул аб нацыянальнай праблеме адбівае закіды, абасноўвае паняцьце нацыі агулам і беларускай у асобнасьці, а так-жа пасвойму бароніць правоў беларускага народу на палітычную і эканамічную самастойнасьць у агульна-расейскай фэдэрацыі. Вось хоць некаторыя даслоўныя выбаркі з апошняга артыкулу ў „Гомоне“, які яскрава пацьвярджае вышэй сказанае.

„Считаем необходимым энергично защищать Бѣлоруссію, как от польскаго, так и от великороссійскаго насилія... Всѣ особенности Бѣлоруссіи дают права на автономную федеративную самостоятельность в семьѣ других народностей Россіи в будущем“...

У новаўзгадаванай беларускай інтэлігенцыі „не будет того безсознательнаго узкаго національзма, который называется обы-

кновенно „духом",—у нея не будет—бѣлорусскаго духа,—но за то она будет проникнута сознательным народничеством"...

Беларуская інтэлігенцыя павінна зьвярнуць сваю ўвагу не на „развитіе бѣлорусскага языка и на развитіе бѣлорусской народной гордости и сепаратизма", але яна павінна выставіць „на первый план экономическое улучшеніе и политическое развитіе страны... При такой постановкѣ бѣлорусскага вопроса, Бѣлорусов нельзя было бы назвать сепаратистами... Нынѣшній историческій момент является найболѣе удобным для пробужденія Бѣлоруссіи, которая при дружной работѣ и борьбѣ нашей интеллигенціи переродится для новой самостоятельной жизни и займет почесное мѣсто среди других федерацій Россіи на началах свободнаго соглашенія с ними"...

* * *

Маем мы ўжо, такім чынам, агульнае паняцьце аб „Mužyckaj Praudzie" і аб „Гомоне" Для поўнасьці нашых нарысаў дакінем слоў колькі параўнаньня між імі.

Цэнтрам і апорай імкненьняў „Muž. Pr." была Польшча. Каля яе, як каля свайго ядра, мела тварыцца фэдэрацыя, — аб якой там яшчэ выразна не ўспамінаецца, — народаў быўшага Вял. Кн. Літоўскага. У „Гомоне" ўжо яўна спатыкаем ідэю фэдэрацыі, але ўжо з Расеяй, чаго вымагалі тагачасныя гістарычнапалітычныя варункі Беларусі.

„Muž. Pr." пісалі і выдавалі беларусы каталікі польскай культуры, а сярод беларускіх народавольцаў-гоманцаў ужо паяўлялася беларуская інтэлігенцыя праваслаўная. Першыя яшчэ аглядаліся на Польшч і на традыцыі Вял. Кн. Літ., а другія лучылі лёс Беларусі з Расеяй і ўжо аб традыцыях Вял. Кн. Літ., калі ня лічыць Грынявіцкага, бадай ня помнілі нічога. Гэтыя інтэлігенты ўжо не называлі сябе літоўцамі, як гэта рабіў Каліноўскі і нават яшчэ Грынявіцкі, але выразна беларусамі. Яны ўжо перасталі жыць традыцыямі Вял. Кн. Літоўскага.

Можна сьмела сказаць, што на беларускіх народавольцах, што групаваліся каля „Гомону", ці мо' яшчэ лепш: на самым „Гомоне" —традыцыі польскія, шляхоцкія, літоўскія адмерлі цалком. Такім чынам „Гомон"—гэта сапраўды далейшы і зваротны пункт у беларускай палітычна-вызвольнай думцы. „Гомон", як мы ўжо бачылі, усе беларускія землі заве беларускімі, а ўвесь народ наш беларускім і снуе выразныя думкі аб яго палітычнай, соцыяльнай і экономічнай самастойнасьці, чаго так выразна і ў такой меры, у „Muž. Pr." яшчэ не спатыкаем.

Заходзіць так-жа розьніцца між „Гомонам" і „Muž. Pr." і што да ідэолёгічных асноваў іх. „Muž. Pr."—гэта часапіс, які-бы можна было сяньня назваць беларускім радыкальным і сялянскім, або народным радыкальна-дэмократычным, а „Гомон"—гэта ўжо часапіс з ідэолёгіяй—хоць яшчэ не марксоўскай,—але па свойму

соцыялістычнай, які ў аснову будучай Беларусі кладзе, як выразна аб гэтым сам кажа, „научный социализм“.

Калі-ж урэшце ідзе аб беларускі нацыянальны элемэнт, як такі, дык яго ў „Muž. Pr.“ можна бачыць толькі ў тым, што яна была пісана пабеларуску і што бараніла палітычныя і экономічныя правы беларускага народу.

У „Гомоне-ж“ шмат больш беларускага нацыянальнага „духу“, хоць ад гэтага ён энэргічна адкараскваецца. У „Гомоне“ беларускі народ—гэта народ самастойны, розны ад іншых славянскіх народаў, а так-жа мова яго, псыхіка, абычаі, — усё рознае, асаблівае, беларускае. Ужо гэткі пагляд на беларускі народ сапраўды мае ў сабе нямала беларускага нацыянальнага элемэнту. Праўда, „Гомон“ ці з пракананьня, ці мо‘ з тактычных паглядаў, каб не дражніць расейскіх патрыотаў-імпэрыялістых, якія здараліся сярод народавольцаў, заяўляе, што Беларусь да сэпаратызму ня імкнецца, што справу разьвіцьця беларускай мовы і культуры трэба пакінуць „любителям“, бо галоўнай мэтай бел. народавольцаў павінна быць фэдэрацыйная самастойнасьць Беларусі і эканамічны яе дабрабыт, — то ўсёждыкі гэта ўсё не зьмяншае ў ім—наадварот павялічвае—вялікую дозу беларускага нацыянальнага элемэнту. Сам факт разважаньня нацыянальнай беларускай праблемы і адгароджваньне ад беларускага нацыяналізму, гаворыць аб яго існаваньні, аб патрэбе з ім лічыцца і аб патрэбе заняць да яго адпаведнае становішча.

Дык пытаем урэшце, што важнейшае для беларускага народу: „Mužyckaja Prauda“, ці „Гомон“? Здаецца, не памылімся, калі скажам, што абодва гэтыя часапісы важныя кожны ў сваім часе, у сваіх варунках і ў сваім значэньні. „Muž. Pr.“—гэта першае зярнё, першы пачатак беларускай палітычна-вызвольнай думкі, а „Гомон“—гэта тэй-жа думкі прадаўжэньне. Тое, аб чым „Muž. Pr.“ пісала дужа агульна, імглiста, „Гомон“ называў па імені.

„Muž. Pr.“ да беларускага нацыянальнага прынцыпу як такога, да паняцьця бел. народу, як нацыі яшчэ дужа далёка. Сусім да яго блізкі „Гомон“, на які прынцып гэны ўжо насядае, хваляй сваей яго залівае, але й „Гомон“ ад яго поўнага зразуменьня, ад яго прыняцьця ў сваю палітычную ідэолёгію, яшчэ ўхіляецца і адмаўляецца.

Але нядоўга ўжо прынцып беларускай нацыі дабіваўся ў дзьверы беларускага вызваленьня, каб даць яму новыя творчыя сілы і ськіваваць беларускі народ на шлях усебаковага нацыянальнага адраджэньня і соцыяльна-палітычнага вызваленьня. Калі расейскія народавольцы, а ў іх ліку і беларускія, гінулі на царскіх шыбеніцах, тады разьлягаўся новы творчы кліч да беларускага народу слаўнага Фр. Багушэвіча: „Не пакідайце мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі“.

Кліч-жа гэны якраз і выражае той нацыянальны прынцып, які лёг у аснову сучаснага адраджэньня і вызваленьня беларускага народу.

СТ. ГРЫНКЕВІЧ.

Культура й загады нацыянальнае працы.

„Naturalia non sunt turpida“... Натуральным правам і загадам у чалавека будзе імкненьне да шчасьця, паскольki гэнае імкненьне мае грамадзкі характар, а ня вузка-эгоістычныя рамкі. Рэалізацыя гэнага ідэалу ў адзінкі ляжыць на лініі жыцьцёвай кожнага народу, на ўлоньні якога адзінка вырасла.

Ці магчымае зьдзейсьненьне гэтага ідэалу ў нашым шырэйшым разуменьні без асноведзі народу?—Бязумоўна так, калі падыходзіць да пытаньня абстрактна. І адкажам не, калі мецімем наўвеце канкрэтныя формы, канкрэтных людзей, якія дайшлі да некаторага роўня культурнага.

Лінія чалавецкае адзінкі нармальнае, здаровае перасякаецца з лініяю ейнага асяродзішча, а значыцца ў сучасных умовах існаваньня грамадзянстваў, з лініяю, шляхам жыцьцёвым свайго собскага народу. І пачынаецца паміж імі супрацоўніцтва. Кожная з дзьвёх старон нешта дастае й нешта дае. Народ дае сваю мінуўшчыну, свае формы, сваё багацьце ўва ўсіх магчымых праявах, дае магчымасьць фізычнага існаваньня, дае веру ў сэнс змаганьня, дае наканец веру ў сапраўднасьць высокіх ідэалаў. Народ хоча аднаго — бязупыннага развою сваіх цэннасьцяў ува ўсіх шматлікіх галінах жыцьця, якія ўварункованы ягонымі гістарычнымі, эканамічнымі і сацыяльнымі ўмовамі.

Гэнае дамаганьне праяўляецца ў тым, што мы завём к у л ь т у р а ю. Зьмест пайма культуры вельмі багаты й рознаякі, залежна ад таго, адкуль да яго падыходзіць. Культураю ў сэнсе прадмету называцімем усе паасобныя элемэнты творства чалавека ад пачатку ягоных дзён. На гэны скарб складаюцца ідэі, абычаі, вераньні, вынаходы, способы працы, установы грамадзкія й рэлігійныя, праявы мастацтва й побач гэтага ўсе прадметы матар'яльныя, чалавекам выпрадукаваныя ці прыспасобленыя з мёртвае прыроды. Дык трэба нам аддзяліць культуру матар'яльную ад культуры духовае. Яны абедзьве далёка не заўсёды маюць аднолькавую вышыню ў паасобных адзінак, грамадаў, народаў.

Нас тутака будзе цікавіць толькі пытаньне культуры нематар'яльнае. Часта нам цяжка, амаль немагчыма, аддзяліць чалавека ад ягонае вопраткі, ад памешканьня, аднак было-б памылковым глядзець на адзінку скрозь прызму ягонае формы. Адзінка выклікае ўсе праявы духовага жыцьця. Формы могуць выгінаць, абрабляць чалавека паводле аднаго ўзору, калі-ж адначасна ня будзе ў форме зьместу трывалкага й багатага, форма ня трымацімецца. Прыклады гэныя бачым на сабе, у штодзенным

жыцьці, асабліва ў нашых нацыянальных падзеях. Культура гэта ня толькі скарб элемэнтаў, гэта заўсёдная дзейнасьць чалавека ў адносінах да прыроды, да людзей, да псыхікі собскае і чужое.

Культура паймо грамадзкае. Адзінка паасобная, пакуль яна ня злучана з грамадою, калі і пакідае па сабе цэннасьці, дык яны прападаюць бяз ніякае вартасьці. Культура мае вартасьць, калі яна не застыўшы, калі яна ня схованая ў скрыні і не зачынена ў габлётках. Гэныя цэннасьці музэальныя, архіўныя, жывуць дзеля нас настолькі, насколькі выклікаюць у нас рэха, агонь, насколькі мы й тыя багацьці, сустрэнуўшысь з сабою, пачуем нешта супольнае, калі ў нас адгукнецца пачуцьцё, як на нешта сваё, роднае, ці блізкае ў сэнсе блізкасьці агульна чалавецкае. Калі няма гэнага зьявішча, дык няма вартасьці ў дадзеным элемэнце культуры. Толькі суб'ектыўныя адносіны зьяўляюцца тутака важнымі й яны вызначаюць вартасьці вытвораў культуры.

Не хачу казаць, што найвыдатнейшыя выплады духа й гэнія ў галіне музыкі ці малярства ці архітэктуры не зьяўляюцца культурнымі цэннасьцямі, дзеля таго, што яны чужыя й далёкія нашаму, скажам, селяніну. Толькі гэныя цэннасьці ня маюць ніякага дзеяньня дынамічнага на рост унутраны чалавека, яны ня выклікаюць ахвоты, імкненьня прысвоіць іх сабе, дык няма ў іх дзеля гэтага грамадзкага характару.

Ровень культуры народу вызначаецца роўнем культурным масаў й адначасна колькасьцю адзінак, якія стаяць вышэй над гэным роўнем. Ня гледзячы на свомы нам нахіл да дэмакратызму, трэба сказаць, што аканчальна гэная дробная жменька „культурных павадыроў“ выбірае шляхі, па якіх ідуць сябры дадзенага згуртаваньня—народу. Гэнае павадырства зусім натуральны фактар, толькі-ж імкненьнем нашым павінна быць, каб ровень масы падымаць вышэй. Раўнаваньне каб ішло на вярхі, а не каб вярхі тарнавалісь да нізоў.

Кожнае дзіця нарадзіўшысь на сьвет, лучае на ўлоньне культуры свае нацыі. Гэта ня пусты сказ, што шчасьце можна мець толькі пад сваім небам. Сяньнешні поступ навукі аб спадкаберніцтве паясьняе нам, што чалавек паяўляецца на сьвет з вагромністаю колькасьцю розных свомасьцяў і нахілаў, выпрацаваных у гэных, а ня іншых умовах. Дык і культура, з якою дзіця сустракаецца ад першых дзён, яму робіцца блізкаю, чэрпае яно з яе сьведама й нясьведама да таго мамэнту, калі прабуджаецца ў дарослага ці дарастаючага ахвота выступіць дзейна на ніве культурнай. Роля кансумэнта культуры трывае цераз цэлае жыцьцё, аднак неабходна, каб прышла часіна на ролю вытворцы культуры.

Найчасьцей вытворцамі культуры й будуць тыя вярхі — „павадыры культуры“. Як гісторыя паказвае, гэнае зьявішча праведзенае да канца, значыцца максыма аб арыстакратызме ў культуры, азначае заняпад ці культурнае эпохі ці прынамся пэ-

рыяду ў жыцьці народу ці народаў. Аднача̀сна ня можам забывацца, што культура нацыянальная гэта не падзеі аднае ці некалькі групаў адзінак. Культура вырастае з пакаленьня ў пакаленьне й яна супольнае багацьце народу. Дык ня будзем дзівіцца, што спробы, якія наглядаем навочна ў сучаснай Расеі, збудаваць культуру новую, пакінуўшы на старане старую спадчыну, як нешта чужое, кончылісь перамогаю стыхіі народнае й паклікалі на гўтар тайніцаў нацыянальных тых волатаў паэзіі, літаратуры і ўсіх родаў мастацтва, якія ня мелі нічога супольнага з марксызмам ці ленінаўскаю лініяю. Гэта кліч жыцьця, які мацнейшы аканчальна за ўсе праграмы будаўніцтва грамадзкага ці дзяржаўнага. Культура будзе заўсёды адказам агульным на спрадвечныя пытаньні, якія непакоілі чалавека й чалавецтва. Культура гэта функцыя паглядаў і імкненьняў вельмі розных у паасобных пэрыядах, аднак шмат шырэйшых, як можа гэта прыдавацца прадстаўніком аднаго пакаленьня. Дык калі культура гэта адказ на тое, чаго мы хочам, па што жывём, да чаго мы імкнемся, ня будзе тады яна адною падсумоўкаю дасягненьняў матар'яльных, перамогаў над сіламі прыроды. Залежна ад дасягненьняў у розных галінах жыцьця чалавек толькі перамяняецца сам і перамяняе сваё асяродзішча.

Дык вось дзеля чаго можна казаць тое, што я адцеміў на пачатку сваіх разважаньняў. Абстрагуючы ад таго, ці культура мае сваё асобнае надчалавецкае жыцьцё (Гэгэль) і што народ зьяўляецца ўцелаішчаньнем гэтае місіі, трэба сказаць, што бязумоўна чалавек дасьпявае ў сабе й знаходзіць адказ на пытаньні аснаўныя толькі на ўлоньні народу й ягонае культуры.

Шлях развою культуры вельмі няроўны, ён стульна злучаны з падзеямі таго фундаманту, з якога вырастае й на якім стаіць культура. Наглядаюцца ўздоймы й заняпады культураў у сувязі з крызысамі ўнутры аснаўных фундамантаў, на якіх базуецца культура, або ў сувязі з агульным заблытаньнем і зьнявераньнем у сэнс жыцьця ў сусьветным маштабе. Сяньня кажуць аб гэткім крызысе цэннасьцяў рознаякіх. Кажуць, што гэта зьявішча сусьветнае. Аднак ня зусім слушна. Калі крызыс існуе, дык паказвае на тое, што гэтыя вось нязьменныя мамэнты ў жыцьці зьяўляюцца нечым асабліва важным, што чалавек заплгаўшысь, губляе магчымасьць свайго поступу, што „вера" выключна ў сілу грубую не азначае перамогі над жывым жыцьцём.

Бліскучымі, яркімі прыкладамі магутнасьці веры, ідэі зьяўляюцца сяньня некаторыя народы ў Эўропе. Прыкладам між іншым будуць Ліцьвіны. У іхным жыцьці ўнутраным ідуць спрэчкі, ёсьць там змаганьне на розных фронтах паміж сабою. Ня гледзячы на гэта — свабодны ўздойм нацыянальнага жыцьця, узбагачваючы магутна культуру, паказвае, што вера ў ідэал, што напружаньне ўсіх сілаў дзеля ідэальнае мэты, спрычыняецца да шырокага, поўнага жыцьця адзінак.

* * *

З вышэй сказанага зробім некалькі практычных вывадаў. Адносіны да чужое культуры могуць быць пазытыўныя, нэўтральныя й ад'емныя. Ад'емныя адносіны будуць інэртныя або дзейныя (контракцыя).

Актуальныя ад'емныя адносіны могуць быць вельмі дадатнім зьявішчам дзеля роднае культуры. У гэткім змаганьні крысталізуецца востры пагляд на сябе і на чужых, вучыць яго больш быстра аглядацца на ўсё, паказаць лепш сваё роднае багацьце й хараство. Гэныя адносіны выклікаюць зацікаўленьне да свайго ў дагэтуль бязьдзейных, змаганьне будзе кузьняю, дзе куецца на вагні маладых парываў і лятуценьняў новы скарб. Змаганьне прывучае цаніць і даражыць сваімі малымі дробязямі ў форме абычаяў, вопраткі, песьняў, слова і г. д. Змаганьне гэткае культурнае паклікае большую колькасьць кансумэнтаў культуры, заахвочваючы да вытворства, яно зьдзейсьнівае загад масавага распаўсюджываньня культуры. Трэба помніць, што туга да дзейнае ролі ў будаўніцтве культуры вялікая й недахоп сваіх рамаў, калі да гэтага падыходзіць яшчэ націск чужое культуры, кідае адзінкі жывыя на чужое ўлоньне, дзе яны маюць магчымасьць гэнага дзейнага жыцьця. Змаганьне гэнае патрабуе сваіх павадыроў на мясцох. У першую чаргу трэба іх падрыхтаваць ды зарганізаваць ужо гатовых, якія дагэтуль яшчэ ня згуртаваны, трэба значыцца зактывізаваць наш нацыянальны капітал і культурны і чалавецкі.

Актывізацыя культурнага капіталу робіцца ў нас у прэсе, у выдавецкім руху ды ў арганізацыях культурна - прасьветных. Усенька гэта ў слабым і надта слабым тэмпе. Актывізацыя-ж людзкога матарыялу бадай зусім не праводзіцца. Праўда, пара благая, умовы вонкавыя бязумоўна не спагадаюць... Аднак гэта нешта неабходнае. Каб маса перастала быць выключна натоўпам, трэба каб мы маглі ў ёй згледзіць паасобных адзінак, павадыроў натуральных. Трэба распаўсюдзіць нашае багацьце культурнае й тады толькі мецімем актыўных, масавых будаўнічых нашае новае культуры. Варштаты працы дзеля будучых будаўнічых, хаця й невялікія, ёсьць у арганізацыях эканамічных, асьветных і культурных.

Др. Я. СТАНКЕВІЧ.

Севяране—беларускае племя.

У нас прывыклі думаць, што да беларускага народу належылі толькі тры плямёны—Крывічы, Дрыгвічы й Радзімічы. Гэткі пагляд знаходзім дагэтуль у падручніках гісторыі Беларусі, у гістарычных артыкулах і іншым. А тымчасам аказуецца, што некаторыя іншыя плямёны былі беларускія. Гэтта падамо апошнія навуковыя дадзеныя аб нацыянальнай прыналежнасьці Севяран.

Наагул кажучы, Севяране або Север у IX — XII в. займалі Ўзьдзесеньне ці—начай кажучы — прастор ля р. Дзясны (левы прыток Дняпра) і яе прытокаў. У XII в. ў Севяран былі гэткія гарады-месты: Чарнігаў, Пераяслаў, Пуціўль, Ноўгарад Северскі, Трубчэўск, Курск і іншыя.

У навуцы да апошняга часу Севяран пераважна залічалі да Ўкраінцаў. Праўда, А. Шахматаў у арт. „Къ вопросу объ образованіи русскихъ нарѣчій и русскихъ народностей" прызнаваў іх „сярэднярусамі" ці — начай кажучы — лічыў Севяран адными з прэдкаў Белар., але пазьней(у працы „Введеніе въ курсъ исторіи руск. языка" ч. I. 1916 г. і інш.) адносіў іх да плямён украінскіх.

Было колькі прычынаў уважаньня Севяран за племя ўкраінскае. Сяліба Севяран была побач і з сялібаю ўкраінскага племені Палян і прызнаваных Украінцамі Дзераўлян (на ўсход ад Дняпра Севяране, на Заход — Паляне й Дзераўляне); хіба меншая граніца ў Севяран была з беларускімі плямёнамі — на паўночным захадзе з Радзімічамі, што займалі Уссожжа, і на паўночным усходзе з Вяцічамі, што жылі над Акой і яе прытокамі. Даволі было із Северскае зямлі пераплысьці Дняпро, каб апынуцца ў сталіцы даўнейшае й сучаснае Украіны—Кіеве.

Географічнае папажэньне было прычынаю, што Севершчына ў канцы IX в. ўходзіць у склад Кіеўскага княства і з малымі перарывамі астаецца ў ім да 1054 г. Адгэтуль (ад 1054 г.) Севершчына творыць асобнае гаспадарства на чале з галіной Рурыкавічаў, але ажно да татарскага находу, ня зрывае палітычнай сувязі з кіеўскім цэнтрам, у той час як смаленскія Крывічы толькі якісь час былі ў слабой сувязі з Кіевам, а Полаччына адразу вытварае ў сабе апрычоны цэнтр, незалежны ад Кіева. Чарнігава-северскія князі ня страцілі права да кіеўскага вялікакняскага пасаду. Галоўныя северскія гарады—Чарнігаў і Пераяслаў — упамінаюцца побач із Кіевам у ўмовах Рурыкавічаў із Грэкамі *).

*) У палавіне XIII в. Северскае княства ўходзіць у склад новаўтваронага Бранскага ўдзелу. У пачатку XIV в. Севершчына належыць да агульнабеларускага гаспадарства (Вял. Кн. Літоўскага), у каторым была да пач. XVI в. Каля 1500 г. Севершчына была заваявана Масквою. Адгэтуль у працягу 100 год Беларусы стараюцца вярнуць яе назад, што й удалося дапяць у часе Дзеўлінскага міру з Масквою, калі Севершчына была вернена Вял. Княству Літоўскаму.

Калі ў пал. XVII в. за Хмяльніцкага настае адраджэньне ўкраінскае гаспадарсьцьвенасьці, паўстае гэтманства на Слабадзкой Украіне, а Беларусь перажывае ўпадак і ад яе адбіраюць ці мала земляў, у тэй лічбе Севершчыну, апошняя была прылучана да „казацкага“ (украінскага) аўтаномічнага гаспадарства і была ў ім ажно да яго зьністажэньня Масквою ў 1777 г. У часе быцьця Севяран пад Украінаю былі арганізаваны ў Севершчыне тры казацкія палкі: Старадубскі, Чарнігаўскі й Нежынскі. Гэтак з паміж Севяран паўсталі казакі*).

Апошняй ня меней важнаю прычынаю залічаньня Севяран да ўкраінскіх плямён было тое, што цяперака паўднёвая часьць даўнейшай зямлі северскай занята ўкраінскай моваю.

У 1927 г. выйшла праца проф. Маскоўскага ўнівэрсытэту П. Растаргуева п. н. „Северско-белорусский говор“ **). Аўтар пачаў працаваць над сваёй тэмаю на раду акад. А. Шахматава, катораму й пасьвяціў сваю працу. П. Растаргуеў паходзіць із м. Старадуба ў Чарнігаўшчыне, значыцца з цяперашняга цэнтру таго дыялекту, адумысловым дасьледаваньнем каторага ён заняўся. Местапаходжаньне Растаргуева дало яму лепшую магчымасьць пазнаньня апісанага ім дыялекту. П. Растаргуеў у менаванай працы дасьледуе мову пав. Старадубскага, Мглінскага, Сураскага й Навазыбкаўскага б. Чарнігаўскае губ. і заходнюю часьць пав. Трубчэўскага б. Арлоўскае губ. У сваёй працы аўтар наўперад пацьвярдзіў тое, што было ведама й раней, паймення, што мова менаванага прастору—чыста беларуская. Але пры дасьледаваньню выявіліся такія асаблівасьці мовы вышменаванага прастору, якія няведамы іншым гутаркам беларускім.

Аднэй з гэткіх асаблівасьцяў ёсьць захаваньне звонкасьці сугукаў на канцы слова і перад ціхімі сугукамі. Кажацца там: дзе*д* *лоб*, сто*г*, но*ж*ка, лю*д*кі, а ня дзе*т*, ло*п*, но*ш*ка, лю*ц*кі. Гэтая асаблівасьць супольная з іншымі паўднявымі гутаркамі беларускімі, але ў Чарнігаўшчыне і ў зах. часьці пав. Трубчэўскага яна мацней выражана.

Другой асаблівасьцяй, прытым вылучна беларуска-чарнігаўскай (разам із зах. часьцяй пав. Трубчэўскага), ёсьць аціьвярдзеньне *р* толькі перад *і*, *е*, *ѣ*, *j* (бяр*ы*, бяр*э*, р*э*чка, зьвяр'ё, але вячэр*я*, ур*я*днік).

Менаванымі двума асаблівасьцямі мова беларускае Чарнігаўшчыны і зах. часьці Трубчэўшчыны розьніцца ад іншых беларускіх гутаркаў і лучыцца ў вапрычоны беларускі дыялект.

Ад сябе дадам: з дасьледаваньня Растаргуевага відаць, што беларуская мова Чарнігаўшчыны й зах. часьці Трубчэўшчыны

*) Гісторыя Севяран пададзена паводле разгляданай ніжэй працы П. Растаргуева.

**) Проф. П. А. Расторгуев, Северско-белорусский говор. Исследование в области диалектологии и истории белорусских говоров. Ленинград 1927 г. Бал. 224 і карта беларускага дыялекту Чарнігаўшчыны й Трубчэўшчыны.

належыць да паўдзённа-заходняга нарэчча беларускае мовы, займаючы ў ім палажэньне найбалей зіндывідуалізаванае. Значыцца, мыліўся Я. Карскі і Маскоўская Дыялектолёгічная Камісія, адносячы—Карскі ўвесь менаваны простор, а Камісія вялізную яго большасьць—да паўночна-ўсходняга беларускага нарэчча. Калі-б ня дзьве вышпрыведзеныя спэцыфічныя асаблівасьці мовы разгляданага прастору, дык паводле іншых сваіх асаблівасьцяў яна належыла-б да цэнтральнае групы беларускіх дыялектаў; надта блізкая яна была-б да гутаркаў Смаргонь, Маладзечна, Вялейкі і да падобных да іх *).

П. Растаргуеў не абмежыўся вылучна працаю дыялектолёгічнаю, але дапоўніў яе дадзенымі з археолёгіі й гісторыі. Ад гэтага праца ягоная вельмі выграла: пытаньне северскае дастала ўсебаковае апрацаваньне.

Кіеўскі аўтар летапісу лічыць Севяран сваякамі беларускіх плямёнаў—Радзімічаў і Вяцічаў, а не ўкраінскіх. У кіеўскім летапісе чытаем: „Радимичи и Вятичи и Сѣверъ один обычай имяхуть".

Паводле дадзеных археолёгіі Севяране ў IX—XI ст. займалі блізу што ўсю б. Чарнігаўскую губ. з выняткам невялічкага прастору на паўночным заходзе, часткова занятага Радзімічамі, часткова парослага лесам, часьць б. Курскае й Палтаўскае губ. Гэткім парадкам толькі цэнтральна-паўночная часьць разгледжанага вышэй апрычонага дыялекту беларускага зыходзіцца, паводле археолёгіі, з даўнейшаю сялібаю Севяран. Зусім зразумела, што Севяране пазьней маглі засяліць лясны прастор на паўночным заходзе ды, будучы націсканыя з паўдня сьцяповымі народамі, паціснуць крышку на паўночным заходзе часьць Радзімічаў, займаючы іхнія сялібы.

Але ня зусім ясна, чаму цяперака, замест беларускае, маем украінскую мову ў часьці Палтаўшчыны, Куршчыны і ў паўдзённай Чарнігаўшчыне, займаных у старыну Севяранамі. І тутака прыходзіць нам на помач гісторыя. Прывяду за П. Растаргуевам патрэбныя гістарычныя ведамасьці.

Гісторыя Нежынскага палку ясна паказуе на позьняе засяленьне яго, не раней пачатку XVII стагодзьдзя людзьмі, што ўцяклі ў гэтую часьць Северскае зямлі **) з-за Дняпра, калі Пясочынскія, Пацы, Кісялі і іншыя паны дасталі гэтта ад караля балей або меней вялікія землі. Займаючы паўдзённую часьць краю, прастор будучага Нежынскага палку ня быў густа населены ўжо ў глыбокай старыне, да татарскага находу. А просьле татарскага спустошаньня з палавіны XIII ст. гэтая мясцовасьць апусьцела. Відавочна, кажа гісторык „Старой Малороссіи" Ал.

*) Раўную да гутаркаў гэтых мясцовасьцяў, як мне найбалей знаных, але бяссумлеву ў паўднёвай часьці цэнтральнае паласы беларускага языка ёсьць гутаркі ня меней а хіба яшчэ балей блізкія да беларускага дыялекту Чарнігаўшчыны й часьці Трубчэўшчыны.

**) А. М. Лазаревскій, „Описаніе старой Малороссіи", т. II, бал. 3.

Лазарэўскі, гэтая мясцовасьць (на паўдня ад Сейма й Астра) да XVII ст. прадстаўляла сабою чыстую пустыню, што дзяліла расейскія й польскія валаданьні *). Пустыннасьць мясцовасьці на паўдня ад Сейма й Астра, паводле Ал. Лазарэўскага, відаць і з таго, што расейская старожа, каторая вартавала Пуціўльскі рубеж ад нападу татараў, „стаяла па берагох р. Сейма, не далей 40 вёрстаў на заход ад Пуціўля, знача: болей меней каля граніцы цяперашняга Канатопскага пав.“, а далей на заход ад гэтага пункту цягнуліся палі, г. зн. незаселеныя землі. Адно на поўнач ад Сейма й Астра былі сялібы, але „яшчэ ў пачатку XVII ст. яны сустракаліся адно зрадка“. Цяперашнія месты: Нежын, Глухаў, Батурын, Кролевец, Конотоп, Борзна і інш. былі закладзены або адноўлены не раней першае чэцьверці XVII ст. па Дзеўлінскім міру. У вадным акце 1624 г. кажацца, што „Мѣсто Нѣжынъ, отъ многихъ лѣтъ опустошалое, значне за ласкою Божію растеть, и що разъ людей до яго пребуваеть“ **). У грамаце Жыгімонта III, дадзенай м. Нежыну 1625 г., названы ён яшчэ „Новаселым“ ***) местам. Ё яшчэ шмат іншых дакумэнтаў аб колёнізацыі Украінцамі з правага боку Дняпра паўдзённае часьці Чарнігаўшчыны. Калёністыя на поўнач ад Сейма й Астра мяшаліся з мясцовым (северскім) насяленьнем, ад чаго ў мове гэтага прастору дагэтуль ёсьць ня мала беларускіх асаблівасьцяў (аканьне і інш.).

Але на поўнач ад Дзясны, а так-жа ў часьці Глухаўскага ды ўсяго Ноўгарад-Северскага пав. Украінцы не колёнізавалі. Тут асталося даўнейшае беларускае насяленьне. А. Шафонскі, характэрызуючы мову „Малой Россіи“ ў канцы XVIII ст. (1786 г.), адцемлюе, што Палесьсе, г. зн. часьць Ноўгарад-Северскага, Глухаўскага, Кролевецкага, увесь Погарскі *), Мглінскі, Новамескі **), заходняя часьць Сосьніцкага, Горадніцкі ***) павет і мясцовасьць Чарнігаўскага пав., ляжачая на правым баку Дзясны, маюць блізу што такую вымову, як у Беларусі й Ліцьве“ ****). Тут ня так важна тое, што ў менаваных мясцовасьцях мова „блізу што такая, як у Беларусі і Ліцьве“, бо няма ведама, што значыць „блізу што“, як важна ўтассамленьне мовы часьцяў паветаў Чарнігаўскага, Сосьніцкага, Кролевецкага, Глухаўскага й Ноўгарад-Северскага з моваю паветаў Старадубскага, Новазыбкаўскага і інш., аб беларушчыне мовы каторых нямашака сумлеву. Значыцца, у пав. Ноўгарад-Северскі, у лежачыя на поўнач ад Дзясны часьці паветаў Чарнігаўскага, Сосьніцкага й Кролевецкага і ў часьці Глухаўскага ўплыў украінскае мовы прыйшоў пазьней

---

*) Ibid., бал. 1.

**) А. Ив. Рагельман, „Летописное повествованіе о Малой Россіи“ М. 1847, бал. 142.

***) Ibid., бал. 138.

*) м. Погар у прадваенным Старадубскім пав.

**) Пазьней Новазыбкаўскі.

***) Гараднянскі.

****) Пад Літвой тут разумеецца таксама Беларусь, але ня ўсходняя.

без украінскае колёнізацыі, бо калі-б таковая ў навейшыя часы была, дык аб ёй добра ведалі-б. У мове гэтых мясцовасьцяў асабліва многа беларускіх асаблівасьцяў.

Што тычацца часьцяў Курскае й Палтаўскае губ., што ўходзілі ў склад Северскае зямлі, дык тутака з канца першае паловы XVIII ст. абраз быў яшчэ смутнейшы: Пераяслаўскае княства было так спустошана, што з гэтага часу „зусім чэзьне з гістарычнага гарызонту" *. Гэткая-ж была доля й Курска, адбудаванага нанова адно ў канцы XVI ст. **). У 50-х гадоў XVI ст. найбольш паўднёвым горадам Маскоўскага гаспадарства быў Пуціўль, што ўходзіў у пярэднюю лінію ўмацаваньняў, каторую складалі гарады: Алатыр, Цемнікаў, Кадом, Шацак, Раск, Данкоў, Епіфань, Бранск, Міхайлаў, Дзядзілаў, Навасіль, Мцэнск, Арол, Ноўгарад-Северскі, Рыльск і Пуціўль ***). За гэтымі гарадамі пачынаўся сьцеп. Заселены ён быў пазьней у XVII ст. дарогаю колёнізацыі, пры чым апошняя йшла галоўна з-за Дняпра.

Украінскія летапісы паловы XVII ст. (Самавідца, Грабянкі) пішуць аб масавым пераходзе насяленьня з-за Дняпра. Перасяленьні гэтыя былі ня толькі самаахвотныя, але й пад прынукаю. Самавідзец, Грабянка, Сіманоўскі, Рыгельман і іншыя аўтары летапісаў і гісторыкі кажуць, паміж іншым, аб тым, як у 1679 г. гэтманіч Сымон Самойлавіч, сын гэтмана Самойлавіча, жыхароў Ржышчава, Карсуня, Мошны, Драбоўкі, Чаркасаў, Жабоціна і інш. загнаў на левы бераг Дняпра *). Гэтман Самойлавіч у сваім наказе аб гэтай „экспэдыцыі" кажа, паміж іншым, што ўсе „жыхары ржышчаўскія, канеўкія, карсунскія, стараборскія, мошанскія, грабоўскія, белазерскія, цеганкоўскія, драбоўскія, чаркаскія на яго бок прыгнаны і ад непрыяцеля аддалены, а месты, мястэчкі й сёлы іхнія, дзе яны ўперад жылі, на тым баку ўсе без астачы спалены **). Колькасьць перасяленцаў была вялікая. Прыкладам гэтман Самойлавіч у 1675 г. вядзе перагаворы з маскоўскім урадам аб пасяленьню 20.000 сем'яў ***). Перасяленьне наагул было масавае і абыймае час ад 1652 да 1712 г. ****).

Дык ясна, чаму нямашака цяперака Беларусаў у часьці Палтаўшчыны, Куршчыны і ў паўднёвай часьці Чарнігаўшчыны, займаных калісь Северанамі. Адначасна дадзеныя мовы, археолёгіі й гісторыі ясна паказваюць, што Северане былі беларускім племенем *****). Захаваліся іхнія патомкі з чыстай сваёй ці — начай—беларускай моваю ў паўночнай палове Чарнігаўшчыны.

*) Д. Ив. Багалей „Очерк ист. колониз. степной окраины Московск. Госуд." 1887, бал. 63.

**) Ibid, бал. 65.

***) Ibid., бал. 36.

*) Д. Ив. Багалей, Op. cit., 402.

**) Ibid. 404.

***) Ibid. 403, 405.

****) Ibid. 442.

*****) Шмат Беларусаў мае прозьвішча Сяўрук. Вось-жа Сяўрук і Северанін тое самае, бо гэнае ёсьць зьмяншэньнем гэтага (другога). Відзім

Прыведзеных вышэй довадаў даволі, каб даведацца, што Севяране былі беларускім племенем. Але, хоць-бы дзеля цікавасьці, нельга не адцеміць, што назоў Севяране ўжываўся яшчэ ў XVII і на'т у XIX стаг. уадносінах да Беларусаў Чарнігаўшчыны.

У 1684 г. стараста мозырскі, Казімер Халецкі, у сваім лісьце да Старадубскага палкоўніка С. Самойлавіча, паміж іншым, кажа: „Як і ў нас людзі Северскія й украінскія бываюць“ *). Тут адначасна бачым, што Беларус К. Халецкі, а значыцца, трэба думаць, і Украінец Самойлавіч не прызнаваў Севяран Украінцамі.

У 1862 г у часапісе „Основа“ ў варт. „О городницкомъ нарѣчіи“ (значыцца горадненскім) чытаем: „поўнач губэрні (паветы: Сураскі, Мглінскі, Старадубскі й Новазыбкаўскі) занялі Беларусы, ведамыя ў жыхароў іншых паветаў губэрні пад іменем літвіноў, сіверан, полісцеў і подзэгун“ (разьдзел XX, бал. 47) Тутака назоў Ліцьвіны—агульнабеларускі, Севяране—пляменны, Палесцы—тое самое, што паляшукі. У вужшым значэньню Паляшукамі завуць Беларусаў Палесься, у шыршым — тых наагул Беларусаў, у мясцовасьцях каторых мноства лясоў, у найшыршым значэньню Паляшукамі часта завуць усіх Беларусаў дзеля лясістасьці іхняга краю. Падзэгунамі, Дзэгунамі і падобна нярэдка дражняць Беларусаў іхнія суседзі Маскоўцы й Украінцы, а часам іншыя—дзеля беларускага дзеканьня.

Украінскі філёлёг К. Міхальчук так-жа сьведчыць, што Украінцы ў XIX ст. звалі Севяранамі насяленьне Чарнігаўшчыны, ляжачай на поўнач ад Дзясны **).

Значэньне належнасьці Севяран да беларускага народу вельмі вялікае, дзякуючы гэтаму гісторыя беларускага народу і гісторыя яго культуры ладне багатшая й размавітшая. Прыкладам найслаўнейшы ў усёй Славяншчне ў сераднявеччу эпічны твор—„Слова аб палку Ігаравым“—паўстаў у Северскай зямлі, гэта поэма аб паходзе Северскіх князёў на Полаўцаў. Ведаючы, што Севяране—Беларусы, нельга сумлявацца, што „Слова аб палку Ігаравым“—твор беларускі; шмат мясцовасьцяў у Северскай зямлі зьвязана з паўстаньнем „былінаў“ аб Ільлю Мураўленіну і інш.

Даведаўшыся, што Севяране беларускае племя, мы тым самым пашырылі веду аб нашых прэдках і іхнім жыцьцю, а тым самым і аб самых сабе.

гэта ня толькі з хормаў гэтых назоваў, але й дакумэнтаў гістарычных. У беларускім летапісе Быхаўцавым чытаем „Мужыкі маскоўскія, прышоўшы пад Пуціўль і на Ціхой Сасьне, пагрáмілі Сяўрукоў Вітаўтавых, узялі ў іх два бабры, а тры кадзі мёду“ (519). Далей кажацца як за гэта Вітаўт маніўся пакараць Маскву, але ягоны зяць, маскоўскі князь Васіль, папрасіў у яго выбачэньня, за шкоду заплаціў, і яны пагадзіліся, пры тым сустрэліся пасярод р. Вугры і яе граніцаю палажылі паміж сваімі гаспадарствамі. Як відзім, у летапісе Сяўрукоў знаходзім тамака, дзе жылі Севяране, значыцца сеўрук — северанін. Прозьвішча „Сеўрук“ паказуе, што собсьнік ягоны ў некаторай меры паходзіць ад Севяран.

*) Усе жаролы паказаны ў Растаргуева. Цытата прыведзеная паводле сучаснага правапісу.

**) Труды этногр.-статыст. экспед. въ западно-руск. край, т. VII, бал. 462.

А. КЛІМОВІЧ.

Апошнія гады паншчыны на Беларусі.

У гістарычным працэсе пераацэнак усякіх вартасьцяў, зямля вартасьці ня губляе. Таму рэформы ўсіх часоў і народаў у сваіх меркаваньнях ня толькі не маглі абмінаць зямельнага пытаньня, але блізу заўсёды з яго выходзілі і да яго кіраваліся. Больш таго: удача ці няўдача самых рэформаў, якія мелі на ўвазе сялянскую масу, заўсёды залежылі ад таго, як у праекце датычнай рэформы вырашалася пытаньне зямельнае.

І мы, беларусы, стаім сягоньня прад патрэбай вялікай рэформы, прад улажэньнем свайго собскага сьветагляду, абапёртага на дакладна дасьледжанай беларускай мінуўшчыне. Землyробскі характар Краю нашага вымагае асабліва правільнага вырашэньня зямельнага ў нас пытаньня на будучыню. Дзеля гэтага трэба добра ведаць мінуўшчыню, якая ў сэнсе гаспадарчым і асабліва зямельным дасьледжана вельмі скупа. Сёе - тое ведама яшчэ аб гэтым з боку гістарычнага, менш — з боку праўна грамадзкага і найменш — з боку сьцісла гаспадарчага.

Ня месца тут дашуківацца прычын такога зьявішча. Сьцьвердзіць толькі трэба, што адсутнасьць сваіх працаўнікоў над вывучэньнем зямельнага ладу Беларусі заважыла над Краем проста фатальна. Разьбіраючы сягоньня сьляды працы на гэтым полі людзей чужых, раз за разам сустракаем супярэчнасьці ў самых навет падставовых пытаньнях. Доказ гэта, што людзі працавалі тут ня гэтулькі для самай навукі, для праўды, колькі для апраўданьня „рацыі" раз адных, іншы раз другіх нашых суседзяў, каторых зацікаўленасьць беларускімі справамі выплывала з крыніц нам ня толькі чужых, але найчасьцей і цалком варожых.

Пры гэткім палажэньні, вывучэньне зямельнага ладу Беларусі становіцца заданьнем на колькі важным, на гэтулькі і нязвычайна цяжкім. Час аднак уцякае і адносячы ў няпамяць нядаўныя навет падзеі, наказвае пазнаваць іх, зьбіраць, укладаць і... карыстаць. На сыстэматычнае ўлажэньне ўсіх падзеяў, што адносяцца да гісторыі зямельнага ладу Беларусі, няма тымчасам ні ўсіх матар'ялаў да гэтага патрэбных, ні сілаў, ні часу. Усяму аднак свой час. Прыйдзе гэты час і на сыстэматычнае пазнаньне зямельнага ў нас пытаньня. Пакуль-жа гэта станецца, цэннай і неабходнай будзе кожная зацемка, кожны нарыс, які асьвятляў-бы справу з якога-колечы боку. З гэткіх зацемак з часам уложыцца цэласьць сваей беларускай гістарычнай канвы, на каторай можна будзе беспахібна снаваць і свой-жа беларускі ўзор зямельна-грамадзкага ладу.

Гэта маючы наўвеце, прыгледзьмася тымчасам на хвіліну да тых парадкаў, якія ў зямельным пытаньні мелі месца на Беларусі ў нядаўняй яшчэ мінуўшчыне: ад пачатку XIX стагодзьдзя да 60-тых гадоў таго-ж стагодзьдзя.

Агульнае палажэньне. Апошнія гады XVIII-га і першыя гады XIX-га стагодзьдзяў, гэта пара паступовага пераходу беларускіх зямель спад улады Польшчы пад уладу Расеі. Пасьля першага падзелу Польшчы ў 1772 г. адыйшлі да Расеі губэрні Магілёўская і Віцебская, пасьля другога падзелу ў 1793 г.—губ. Менская і пасьля трэцяга, у 1795 г.,—губ. Віленская і часьць Горадзенскай. Беласточчына-ж апынулася ў межах Расеі толькі ў 1807 г., пасьля міравога дагавору Расеі з Францыяй (Напалеонам) у горадзе Тыльжы (ў Прускай Літве). Такім чынам ад 1807 г. ўсё жыцьцё беларускіх земляў кіравалася пад уплывам ўставадаўства расейскага. Каб зразумець аднак тагачасныя парадкі, трэба аглянуцца крыху ўзад.

Гісторыкі прадпадзельнай Рэчыпаспалітай (Польшчы), да якой тады належала большасьць Беларусі, вельмі нялюба адклікаюцца аб тагачасных у ёй парадках, проста навет кажучы, што сам упадак дзяржавы—гэта рэзультат самаволі шляхоцкага стану. Цярпеў ад гэтай самаволі селянін польскі, і — пэўне-ж — цярпеў ад яе ня менш і селянін беларускі. Першы падзел Польшчы здрыгануў сумленьнем лепшых сыноў краю. Сёе-тое пачалося рабіцца дзеля направы долі беларускага сялянства. Да гэтае пары адносяцца між іншым натугі гэткіх людзей, як граф Яхім Хрэптовіч (1729—1812) у сваіх беларускіх дварох: Шчорсы і Нягневічы ў Навaградчыне ды Вішнева ў Валожыншчыне *), граф Бжостоўскі — у дварэ Паўлава пад Вільняй **) і інш. Адны з іх вытрывалі да канца (да уставовай рэформы 1861 г.), пакідаючы дагэтуль жывую і ўдзячную памяць у народзе, напр. Хрэптовічы, іншыя ўзноў, як граф Замойскі ў дварэ Бежунь ***), не канечна з благой волі, а хутчэй з простага зьняверањня ў пачатую саматужна справу, па колькінаццацёх гадох варочаліся да парадкаў старых... Пры гэтых-жа старых, згубных парадках, трывала і ўся мясцовая шляхта і таму палажэньне сялянства ў нас усьцяж горшала.

Крыху ў лепшых варунках былі сяляне вялікіх каралеўскіх двароў („каралеўшчын“); прынамся маглі яны, мелі права, жаліцца, тады як сяляне двароў прыватных залежалі ад шляхты цалком: шляхта выконвала над сялянамі ўсялякую ўладу, паліцыйную і нават судовую.

---

*) Проф. М. Д. Запольскій: Страница из исторіи крѣпостного права в XVIII—XIX вв. Масква, 1906 г. бач. 22 і наступныя.

**) Там-жа.

***) Там-жа бач. 23.

Беларусь пад Расеяй. А. Турцэвіч*), якога ніхто хіба не западозрыць у малой адданасьці для Расеі, які Расею ўсюды хваліў, аб палажэньні беларускага сялянства з тае пары, як яно дасталася пад расейскае панаваньне, піша між іншым гэтак:

„з гэтага часу (ад часу прылучэньня да Расеі—А. К.) палажэньне іх (беларускіх сялян — А. К.) ні чуць не палепшылася. Перад усім ні колькі не палепшылася гаспадарчае палажэньне сялян. Польская шляхта, страціўшы права жыцьця і сьмерці над сваімі падданымі, ува ўсіх іншых адносінах цалком захавала над імі сваю ўладу. Яна пастарому магла ўстанаўляць якія хацела павіннасьці... Так у адных дварох вельмі павялічыўся лік дабавачных прыгонных дзён, у другіх — мноства дані ў натуры, у трэціх—мноства падаткаў грашмі і г. д. Напр., у вялікім дварэ Казяны, Віленскай губ., які ў 1797 г. імп. Павал I падараваў графу Манузі, з чэцьверці валокі сяляне адбывалі гэткія павіннасьці: паншчыны — па 3 дні ў тыдзень, чыншу плацілі па 100 злотаў, сухой (?) арэнды — па 9 злотаў і па некалькі зл. за катлы; акрамя таго кожны селянін павінен быў даць памешчыку палову сабранага ім мёду і паставіць адну хурманку ў Рыгу, якая ацэньвалася на 40 злотаў**).

„Пасьля на беларускіх (у арыгінале, натуральна, „западно-русских" - А. К.) прасторах значна ўсілілася прадажа сялян без зямлі. Гэта галоўным чынам дзеля таго, што вялікарускія памешчыкі сталі ахвотна купляць тут сялян для здачы іх у рэкруты за сваіх людзей... Напр. у Віцебскім і Рагачоўскім паветах толькі ў працягу трынаццацёх гадоў было прададзена 48 сем'яў, што складаліся з 182 душ і асобна ад сем'яў 113 мужчын, 48 дзяўчат і 39 хлапчукоў, разам 382 душы. Цэны на сялян у сярэднім вывадзе можна прызнаць наступныя: сялянская сям'я цанілася каля 75 рублёў, дарослы мужчына—каля 50 рублёў і дзяўчына—каля 10 рублёў ***)".

Вольныя людзі, якія да расейскага панаваньня жылі ў прыватных дварох на падставе дабравольных кантрактаў, цяпер таксама прыпісваліся да мясцоў свайго жыцьця і бяз ведама ўрадавых камісараў гэтага месца не маглі пераменяць. Гэткае ўзалежненьне людзей перад тым вольных прывяло іх цяпер у стан, які ня шмат розьніўся ад сапраўднай паншчыны... І так скрось і так усюды.

Чым усё гэта вытлумачыць?

Прычына галоўная была ў тым, што тагачасная Расея (першыя гады XIX стаг.) была наскрось прыгонная і ў далучаных беларускіх землях бачыла таксама толькі „вярхі", шляхту.

---

*) А. Турцевич: Русскіе крестьяне под владычеством Литвы и Польши. Вільня, 1911 г., бач. 66 і наступныя.

**) Віл. Цэнтр. Арх. кн. № 12054, л. 519 (паводле Турцэвіча).

***) Віленскі Цэнтр. Архіў, кнігі Рагачоўскага паветавага суду пад нумарамі 1752—1765 і кнігі Віцебскага пав. суду пад нумарамі 137—156. (Турцэвіч).

Хочучы здабыць гэту шляхту для сваіх-жа расейскіх інтарэсаў, расейскі ўрад авансам нагараджваў яе тым, што Расеі нічога не каштавала: інтарэсамі беларускага сялянства, аддаючы іх на пачатак безкантрольна пад уладу шляхты.

Гэткае становішча і пагляд расейскага ўраду на тутэйшыя варункі трывалі ня толькі ў пару „лібэральнага“ Аляксандра I, але і за Мікалая I. Толькі Аляксандр II гі, падчас бытнасьці сваей ў Вільні ў 1860 г., заявіў маршалкам мясцовай шляхты: „Скажэце шляхце, што я з яе нездаволены; хай ведае яна і Эўропа, што гэта (—беларускія землі—А. К.) ня Польшч *).

Тымчасам аднак шляхта гэта аддавалася старым сваім навыкам. Зьняверыўшыся да ўсяго, ці зьняверанньнем толькі прыкрываючыся, усё большы лік шляхты вяртаўся да земляробства і пачынаў гаспадарыць, замыкаючыся гэтак у вузкі круг сваіх прыватна-гаспадарскіх інтарэсаў. Пабуджала шляхту да гэтага і добрая тагачасная коньюнктура на сусьветным рынку, дзякуючы якой прадукты земляробства знаходзілі там вельмі добры збыт. Гэта так „узахвочвала“ шляхту да земляробства, што яна ўсё новыя абшары забірала пад сваю дворную гаспадарку, абрэзваючы гэтым самым надзелы сялянскія, або і цалком выкідаючы сялян з загаспадараваных сялібаў на бязвартасныя і зусім дзікія пустыры.

Інвэнтарныя камітэты. Сяляне-ж пастарому былі зусім безбаронныя і, даведзеныя да астатку цярплівасьці, знаходзілі адзіны толькі спосаб — уцякаць, куды вочы сьвецяць. Калі гэткае ўцяканьне ставалася штораз часьцейшым, а нават масавым, у дварох пачаўся адчувацца недастатак рабочых рук. Не знаходзячы іншага способу папоўніць гэты недастатак, памешчыкі пачалі абкладаць сялянства йшчэ новымі, цяжэйшымі прыгоннымі забавязаньнямі **). Гэткае самавольнае павялічэньне паншчыны было нагэтулькі цяжкім і дакучлівым, што раздражніла нават і беларускага селяніна, наагул зраўнаважанага і спакойнага. Пачаліся спачатку скрытыя, а пасьля і яўныя разрухі. На гэта аднак ня мог ужо астацца сьляпым і расейскі ўрад і, ня хочучы дапусьціць да горшага, прыняў гэтым разам выгодную для сябе міну абаронцы сялянства, наказваючы 15 красавіка 1844 г. сарганізаваць між інш. у Вільні Галоўны, а ў Коўне і Горадні — губэрскія, гэтак званыя Інвэнтарныя Камітэты, заданьнем якіх было сьпісаць усе прыгонныя забавязаньні і правы сялян перад дварамі ў кожным паасобным выпадку, у кожнага памешчыка. Гэтак устаноўленых забавязаньняў няможна было адгэтуль ні зьмяняць, ні павялічываць ***).

Каб у малой хоць меры мець паняцьце аб тым, як выглядала ў нас паншчына ў 40-ых гадох мін. ст., пазволім сабе тут

*) „Pamiętniki Jakóba Gieysztora—Вільня, 1913 г., т. I. бач. 89.

**) Witold Staniewicz: Rzut oka na rozwój dziejów agrarnych na ziemiach litewskich. Адбітка з „Ateneum Wileńskie“ № 5, Вільня, 1924 г.

***) Witold Staniewicz: Rzut oka...

падаць кароткі пераказ такога інвэнтарнага апісаньня двара Клюшчаны ў Сьвянцянскім пав., памешчыка Яна Шырына *).

Усяго аромай зямлі ў дварэ рахавалася $278^1/_8$ дзес., а сенажацяў (пожняў)—176 дзес. З гэтага да двору належала 69 дзес. аромай зямлі і 45 дзес. сенажацяў, а сялянам $209^1/_2$ дзес. ароміны і 131 дзес. сенажацяў. Поўны надзел сялянскі лічыўся ад 19 да 21 дзесяціны; з гэтага: 13 дзес. ароміны і 8 дзес. сенажаці. Ураджай збожжа абазначаны „ў чатыры зярняты", а сенажаці мелі даваць з дзесяціны па $6^1/_8$ дзесяціпудовых вазоў сена. Гэткая сялянская гаспадарка ў сярэднім складалася з 10 душ, разам з старымі і малымі. Рухомая маемасьць яе прадстаўлялася гэтак: коняў—2, жарабё — 1, валоў — 4, кароў — 5, цялушак—2, авечак—9, сьвіней—4, козэў—2 і курэй—9 **). Сенажаці ў інвэнтарным апісаньні гэтага двору названы „мурожнымі", а палі — „чарназём з глінай", хоць сягоньняшнія жыхары гэтых зямель, пры ўспаміне аб „мурогу" і „чарназёме" ў іх, паціскаюць толькі плячыма. Высокая з боку памешчыка ацэнка якасьці грунту аднак зразумелая: памешчык гэтым тлумачыў Інвэнтарным Камітэтам—таксама з памешчыкаў зложаным—тыя забавязаньні, якімі былі абложаны сяляне ў ягоным прыгоне. А забавязаньні гэтыя сапраўды ня былі малымі.

Самага толькі сталага прыгону („работы") з валокі было 8 (восем!) дзён у тыдзень, 4 мужчынскія (з упражай) і 4 жаноцкія. Апрача прыгону сталага, у рабочы час, ад 25 чэрвеня да 25 верасьня, „як з даўных часоў, так і цяпер" (1844 г.) сяляне служылі йшчэ гэтак званыя згоны або гвалты, на каторыя ў год з гаспадаркі трэба было даць: 12 пешых дзён муж., 12 гэтакіх-жа дзён жан.,; да гэтага для працы ў гародзе па 2 дні вясной і 2 дні ўвосені, разам—28 дзён.

Але гэта йшчэ далёка ня ўсё. Увесь гной з двара трэба было вывезьці за 1 тыдзень, бяз увагі на тое, колькі яго ёсьць. Малацьба таксама была паза нармальнай колеяй: „звычаем даўных часоў кожны селянін (гаспадар) паколеі павінен прысылаць работніка ці работніцу ў панскі двор для малацьбы, да сканчэньня яе, у помач машыне". Трэба аднак зазначыць, што губэрскі Інв. Камітэт нават ня прызнаў „звычаю даўных часоў" і наказаў пану Шырыну на вывазку гною і на малацьбу браць людзей толькі звычайным парадкам, залічваючы дзень працы за дзень прыгону.

Дадаць тут трэба, што рабочы дзень у Клюшчанскім дварэ рахаваўся: вясной, улетку і ўвосень ад усходу да заходу сонца, а ўзімку—ад 5 гадз. рана да 7 увечары.

Часам прыгон мерыўся не на дні, а на „урокі" (пасягоньняш-

*) Віленскі Дзярж. Архіў: Arch. Deput. Szlach., Komit. Inwent., № 2113.

**) Гэтыя дадзеныя аб стане гаспадаркі, як і ніжэйпададзеныя прыгонныя абавязкі тыповай сялянскай гаспадаркі ўзяты з вышэйназванага інвэнтарнага апісаньня і адносяцца да гаспадаркі Івана К. з в. Казаноўшчына, якая належала да двара Клюшчаны.—А. К.

няму—„акорд“) і тады: „за 4 дні муж. прыгону на адным тыдні трэба было выараць 2 маргі (паўтары дзесяціны) аромiны, забаранаваць за 3 дні, зжаць—за 4, або па 4 жанчыны назначаюцца на гэтым прасторы на 1 дзень... Вывазка куб. сажня дроў лічыцца за 4 дні“... Жаноцкая работа на „ўрокі“ лічыцца гэтак: за 4 дні спрасьці: лёну на талькі паўфунта, кужалю 1 ф., пачэсься 3 ф., зрэб'я 4 ф., воўны тонкай 1 ф., простай 2 фунты.

Для вывазкі дворных прадуктаў на рынак (у Вільню, Дзьвінск, Сьвянцяны) браліся з сялян хурманкі; 30 вёрст дарогі з возам у 20 пудоў рахавалася за 1 дзень прыгону. Аднак 82 вярсты дарогі кожны гаспадар штогод мусіў адбыць дарма (гэта звалася „падоршчынай“).

Не рахавалася ў прыгонныя дні і цяжкая павіннасьць начнога старажаваньня двору ад заходу да ўсходу сонца. Пр-ходзіла-ж на гэта кожны раз двое людзей „безнаганнага паўядзеньня“.

Апрача гэтага была йшчэ павіннасьць „дабавачная“, якая з валочнай гаспадаркі выглядала гэтак:

Пража: талькі (талька=маток)—па $^1/_2$ фунта, грубой пражы па 4 ф. і воўны—па 2 ф.

Дань: па 4 талькі пражы, па 3 курыцы, па капе яёк і па капе грыбоў (баравікоў).

Для поўнасьці зазначыць урэшце трэба, што — паводле таго-ж самага інвэнтарнага апісаньня — арэндная плата з вольнай рукі за валочную гаспадарку паказанай якасьці выносіла ў той час каля 45 руб. Дзень-жа працы ўлетку з упражным інвэнтаром рахаваўся за 15 кап., а бяз упражы (пешы) — 10 кап. Пуд жыта каштаваў 35 кап, пуд сена — 12 кап., курыца — 10 кап., капа яёк—20 кап. і капа грыбоў—6 кап. серабром.

* * *

Гэта некалькі толькі рысак да таго абразу, які прадстаўляе жыцьцё гэтак нядаўняе йшчэ нашае мінуўшчыны. Няпоўны гэты абраз і ня ўзяты да яго хварбы яскравыя. Але і гэтак, як ёсьць, паказвае ён досыць жудасьці, якая для нашых дзядоўпрадзедаў была штодзенным хлебам.

Нічога аднак няма на сьвеце вечнага. Крохкім ёсьць асабліва ўсё тое, што збудавана на людзкой крыўдзе: раней ці пазьней, але зломіцца яго напэўна, хоць і выглядае часам багатым, сільным, непераможным...

І паншчына гэткай быць здавалася, а ў сапраўднасьці быў гэта ў палове XIX стагодзьдзя ўжо толькі „асілак на гліняных нагах“, які зваліўся ад свайго собскага цяжару ў 1861 годзе. Гісторыя-ж пісаная „по особому заказу“ назвала гэта здарэньне „асвабаджэньнем сялян“.

Прычыны, што змусілі гэта „асвабаджэньне“ правесьці ў чын і парадак самага „асвабаджэньня“ паслужаць тэмай для наступнага разважаньня.

Кнігапіс.

МІХАСЬ МАШАРА: „На сонечны бераг!“, зборнік вершаў, Вільня, 1934 г., бач. 78 і „Сьмерць Кастуся Каліноўскага“, поэма. Вільня, 1934 г., бач. 19.

Міхась Машара, гэта поэта самародак, які адзначыў выразны сьлед у нашай поэзіі Заходняе Беларусі, а нават і ўва ўсей сучаснай беларускай літаратуры наагул. Ёсьць ён найбольш плодным і папулярным беларускім поэтам на гэты бок рыскае мяжы.

Ідэолёгічны падклад творчасьці Машары і яе тэматыку я разгледзіў агульна ў сваім артыкуле „Аб беларускай літаратурнай сучаснасьці ў Заходняй Беларусі“ („Нёман“. кн. 5, 1932 г.). Тутака, беручы за падставу менаваныя творы Машары, пераважна спынюся над іх артызмам.

Артыстычная вышыня твораў Машары даволі вялікая, хаця яе на першы пагляд не заўсёды можна спасьцерагчы й належна ацаніць. Гэта з дзьвюх прычынаў. У Машары, побач з вершамі сапраўды мастацкімі й тэхнічна выробленымі, спатыкаюцца, нажаль часта, вершы слабейшыя, з паважнымі заганамі, і яны ў вялікай меры абніжаюць агульную вартасьць яго твораў. Далей, Машара гэта поэта лірык, але перадусім лірык настраёвы. Праўда, спатыкаемся ў яго творах і з пачуцьцёвасьцю, якая часам, як напрыклад у некаторых мясцох лірычнае поэмкі „Сьмерць Кастуся Каліноўскага“, выбухае вялікай сілай, пераходзе ў напружаную дынаміку. Але беручы агульна, настраёвасьць зьяўляецца галоўнай, дамінуючай нотай яго творчасьці, якая не адразу, не так беспасярэдна, як пачуцьцёвасьць, прамаўляе да чытача.

Машара глыбокі лірык. Лірызм ягоны выклікаюць розныя зьявы жыцьця, розныя думкі й станы псыхічныя поэта. Але найглыбейшы й найбольш чысты лірызм выклікаюць зьявы найбольш блізкія поэту, як пытаньні беларуска-грамадзкія, харство прыроды, а таксама настроі асабістага характару. Гэтыя тры матывы, што становяць у пераважнай большасьці тэматыку твораў Машары, уліваюцца ў тры галоўныя цыклі ягоных вершаў: цыкль грамадзкі, прыродаапісальны і асабістых рэфлексіяў. Апошнія пераважна ўходзяць у вялікі цыкль вершаў Машары „Вандроўнае“, названы ў менаваным зборніку з „Торбы вандроўніка“. Над гэтымі трыма цыклямі вершаў поэта, як найбольш характэрнымі, коратка задзержымся.

У цыклю грамадзкіх вершаў Машары, у якіх ён з вялікім захапленьнем апявае красу Беларусі, сьніць аб яе сьветлай будучыні, пераважаюць тоны ўрачыстыя, якія аднак не пераходзяць ніколі ў ненатуральны патос. У гэтых вершах поэта, апяваючы найвялікшыя для яго цэннасьці, з якімі ён арганічна зросься, якія прадстаўляюць частку ягонага „я“, патрапіў выявіць

многа артызму, патрапіў беспасярэдна прамовіць да чытача й выклікаць тыя ўражаньні, якія перажываў сам аўтар. Ладне такіх вершаў спатыкаем у зборніку Машары „На сонечны бераг", а асабліва ў яго лірычнай поэме „Сьмерць Кастуся Каліноўскага". Напрыклад:

О, мой народ!
О, Край мой сонны,
Цябе слабы я—ня збудзіў!
Ты сьпіш, як спаў душой пакорны,
І сонны блудзіш, як блудзіў.

І нат ня чуеш мукаў сына,
Якога выдаў сам на крыж.
За грэх які?—якія віны?
За што бязьвінны ты цярпіш?

Таксама вялікім захапленьнем і шырокім размахам адзначаюцца разьвітальныя словы Каліноўскага з беларускім народам:

О, Беларусь!—мая Марыська!
Каханьне шчырае маё.
Бывай!—расстаньне надта блізка,
Бывай змаганьне і жыцьцё!

Бывай няволя і пакута.
Народ, засьмяглы у паўсьне,
Яшчэ няскора ськінеш путы
І жыць пачнеш сабой сабе..

Гаворачы аб грамадзкіх вершах Машары, трэба падчыркнуць адну вельмі характэрную асаблівасьць поэта.

Ёсьць ёй вялікі оптымізм, глыбокая радасьць жыцьця і вера ў яго вартасьць. Як ведаем, асабістыя абставіны жыцьця поэта склаліся вельмі трагічна. Аднак сільны дух ягоны перамог жыцьцёвыя няўдачы і мроіць аб радасьці і шчасьці. Вось-жа гэтая агульная рыса Машаравых твораў, сьветлы і творчы оптымізм, з асаблівай яркасьцю выступае ў яго вершах грамадзкіх.

Цыкль вершаў прыродаапісальных Машары прадстаўляе таксама не малую цікавасьць. Поэта, апісываючы абразы беларускае прыроды ў розных яе праявах, перадусім бачыць у ей красу, ей песьціцца й захопліваецца. Дзеля гэтага вершы, у якіх апісвае поэта хараство прыроды, адзначаюцца лёгкім, пагодным тонам, многа ў іх пяшчотных і зьмяншальных словаў. Прырода ў творах Машары гэта нішто іншае, як адбітак вонкавага выгляду роднае краіны і яе хараства. З гэтае прычыны адносіны да яе аўтара глыбока суб'ектыўныя. У вершах прыродаапісальных мала спаткаем элемэнту об'ектыўна-апісальнага, эпічнага, у іх выступае цэлы рад лірычных матываў. Той ці іншы абраз прыроды пераважна выклікае ў душы аўтара адпаведныя пачуцьці й настроі. Прырода ёсьць такім спосабам нятолькі красой самой у сабе, але так-жа настраёвым фонам для думак і пачуцьцяў аўтара, якія суладна гарманізуюць з агульным характарам вобразу. Такі спосаб рэагаваньня поэта на хараство прыроды асабліва ярка выступае ў яго вершы „Вясна". Абраз беларускае

вясны, якая родзіць новае жыцьцё, выклікае ў душы поэта многа жыцьцёвай радасьці і ён пяе:

Вясёла, вясёла, вясёла,
Вясьнянаю раньню я п'ян.
Ня помню ні суму, ні гора,
Ня помню ні болю ні ран.
Я сёньня ў жыцьці закаханы,
Асьвечаны блескам вясны.
Гатоў цалаваць на'т парканы,
Кусочкі абсохшай зямлі.
У сіняе неба над вёскай
Узьляцеў-бы, каб крыльля былі,
І ў песьні-б з жаўронкам расплёскаў
Запал свой юнацкай душы.

Вершы, у якіх Машара глыбака закранае асабістыя пытаньні на фоне пытаньняў агульных, шырэйшых, уходзяць у ладнай меры, як я зазначыў, у цыкль „Вандроўнае". Цыкль гэты, зразумела з многімі выняткамі, асабліва характэрны і рэпрэзэнтуе яшчэ адну, вельмі цікавую, рысу ягонага артызму. Зьмест іх прадстаўляе ўдалую мешаніну розных думак і настрояў. Будуць тут пытаньні асабіста-жыцьцёвыя аўтара, яго адносіны да жыцьця і людзей, спатыкаемся тут з матывамі грамадзкімі й прыродаапісальнымі. Але што цікавей, у многіх вершах гэтага цыклю поэта прабуе глянуць на сьвет і на самога сабе праз прызму іроніі. Залежна ад гэтага й хворма верша, дзякуючы сьмелым і арыгінальным стылёвым фігурам, прыбірае спэцыяльны адценак. Вось прыклад:

Галаву прыкрыўшы небам,
З кіем, босы па пяску,
Я пайду з вандроўным дзедам
Адганяць ад сёл тугу.

Такім-жа характарам адзначаецца цыкль вершаў Машары „Падарожнае".

Гаворачы аб фармальна-мастацкіх асаблівасьцях творчасьці Машары, трэба падчыркнуць некаторыя даволі паважныя заганы. Паколькі Машара з гледзішча колькасьці напісаных вершаў зьяўляецца вельмі плодным поэтам, патолькі за мала працуе над іх артызмам. Некаторыя вершы поэта бяз глыбейшага апрацаваньня пускае ў сырой нявыробленай хворме ў сьвет, абніжаючы агульную роўню сваей творчасьці І ў менаваны зборнік папала некалькі такіх вершаў, якія для ўласнага дабра самога аўтара не павінны былі, прынамсі ў такой хворме, наагул друкавацца. Ня віню ў гэтым выключна аўтара, бо, як мне вядома, над укладаньнем зборніка працавалі выдаўцы яго, а не аўтар. Большая будзе карысьць напісаць менш, але напісаць добра, прынамсі без заганаў тэхнічных.

З гледзішча артыстычнага творы Машары адзначаюцца даволі вялікай убогасьцю стылю і мовы. У вельмі невялікай колькасьці опэруе Машара стылістычнымі фігурамі, як у параўнаньні,

мэтафары і інш., якія нормальна зьяўлаюцца неабходнымі дзеля вобразнасьці верша і стварэньня адпаведнага настрою. Таксама мова твораў Машары даволі аднастайная і ўбогая; поэта ня робіць высілку, каб сваю мову ўзбагаціць новымі славамі, сягнуць умела да правінцыяналізмаў, тварыць словы новыя. Адным словам над стылем і моваю мусіць Машара многа папрацаваць, каб выявіць поўнасьцю свой прыродны талент.

Гэтак сама не павінен Машара ігнараваць і тэхнікі верша, якая мае многа заганаў. У менаваным зборніку спатыкаем часта няроўны разьмер паасобных радкоў у вершы, у сувязі з рытмікай часта нарушае акцэнт слова, пераносячы яго зусім ненатуральна на іншы склад, а так-жа вельмі часта, дзеля вымаганае колькасьці складоў, надужывае Машара *ў* нескладовае, ужываючы яго па сугуках на месцы *у* складовага, і наадварот.

Канчаючы мушу зацеміць, што ўспомненыя заганы ў творах Машары я паказаў выключна з тэй мэтай, каб заахвоціць поэта да больш грунтоўнае працы над сваей творчасьцю. Бяручы пад увагу вялікія поэтыцкія здольнасьці Машары і яго прыродны талент, мы мусім ад яго шмат вымагаць, нятолькі з гледзішча колькасьці, але перадусім якасьці мастацкіх твораў.

Ст. Станкевіч.

ТВОРЫ ЦЁТКІ АЛОІЗЫ ПАШКЕВІЧ.

Беларуская Акадэмія Навук Інстытут Літаратуры і Мастацтва. Менск, 1934 г. бач. 92.

Навукова дасьледаваць беларускую літаратуру ў нашых абставінах вельмі цяжка, а ў некаторых прыпадках проста немагчыма. Прычынай гэтага ёсьць нястача навуковых выданьняў поўных збораў твораў беларускіх поэтаў і пісьменьнікаў. У свой час падумаў аб гэтым Інстытут Беларускае Культуры ў Менску, намячаючы ў пляне сваей працы акадэмічнае выданьне поўных збораў твораў беларускіх поэтаў і пісьменьнікаў, у першую чаргу—Фр. Багушэвіча, М. Багдановіча, А. Гаруна і А. Цёткі Гэты плян пачала рэалізаваць Беларуская Акадэмія Навук, выдаючы ў 1928 годзе ў двух томах „Поўны Збор Твораў“ Максіма Багдановіча. У першым томе былі зьмешчаны поэтычныя творы Багдановіча, пераважна дасюль недрукаваныя, у другім—усе творы прозаічныя, не выключаючы нават дробных газэтных артыкулаў і зацемак поэты. Выданьне зроблена бяз закіду, паводле апошніх навуковых вымаганьняў. Тэксты ўсіх твораў Багдановіча былі навукова ўсталены. Дзе толькі была магчымасьць, былі яны прыраўнаваны да рукапісаў і пададзены вар'янты й зьмены між друкаванымі тэкстамі і рукапісамі, або паміж некулькімі рукапісамі, калі такія захаваліся. Не ставала яшчэ толькі выданьня корэспондэнцыі (прыватных лістоў) Багдановіча, якая, як ведама, ёсьць заўсёды беспасярэднай крыніцай дзеля пазнаньня жыцьця

й творчасьці поэты. Але й паміма гэтага была ўжо створана магчымасьць навуковае працы над творчасьцю Багдановіча.

Такім спосабам пачатак быў вельмі добры. Нажаль ён астаўся і дасюль пачаткам. У 1929 г. Аладэмія Навук выдала творы Алеся Гаруна, але гэта ўжо ня быў навукова выданы „Поўны збор твораў“, але толькі — выбраныя творы. Такімі-ж былі „Выбраныя творы“ Паўлюка Труса, выданы ў 1931 г. і „Творы Цёткі“, выданы ў 1934 г. Над гэтымі апошнімі мы й спынімся.

Выданьне „Твораў“ Цёткі, як Гаруна й Труса, з выданьнямі навуковымі ня мае нічога супольнага з дзьвюх прычынаў: не зьмяшчае ў сабе ўсіх твораў поэткі, і што тэксты надрукаваных твораў навукова не ўсталены. Ёсьць гэта звычайнае папулярнае выданьне. Такія інстытуцыі, як Акадэмія Навук, у нормальных абставінах такіх выданьняў ніколі ня робяць, пакідаючы іх выдавецтвам агульным. Але ў Саветах, асабліва ў Савецкай Беларусі, гэта ёсьць магчымым, а часта канечным. Не гаворачы аб іншых галінах жыцьця ў Савецкай Беларусі, Беларуская Акадэмія Навук ад некулькіх год, побач з работай навуковай, мусіць рэалізаваць пляны чыста практычнага характару. Бальшавіцкія ўлады, выкінуўшы з Акадэміі большасьць шырока ведамых беларускіх навуковых працаўнікоў, змусілі гэтую Інстытуцыю, высокую па свайму назову й недалёкай традыцыі, вясьці камуністычную й русафільскую агітацыю, арганізаваць масавыя выступленьні сярод рабочых на хвабрыках і г. д. А калі і вядзецца навуковая праца, то яна ня служыць навуковым мэтам, але агітацыйным. Вось-жа і прычыну няпоўнага выданьня твораў Цёткі паясьняе Інстытут Літаратуры й Мастацтва Акадэміі наступным:

> „У гэты зборнік твораў пісьменьніцы не ўвайшлі тыя вершы, апавяданьні і артыкулы, дзе асабліва выразна выяўлены буржуазна — нацыяналістычныя погляды Цёткі, яе арыентацыя на кулацкую, сялянскую гаспадарку, таксама як і тыя, дзе яна ідэалізуе дробна-буржуазныя нацыяналістычныя партыі, асабліва БСГ, (Беларускую Соцыялістычную Грамаду—Рэд.), якая на абвостраных этапах рэволюцыйнага змаганьня яскрава праяўляла сваю здрадніцкую ролю і з якой (партыяй БСГ) Цётка была зьвязана арганізацыйна“...

Падумае нехта, што такое выданьне „Твораў“ Цёткі было падыктаванае мэтамі практычнага характару, а не навуковага. Аднак так ня ёсьць. Інстытут Літаратуры й Мастацтва Акадэміі гаворыць ніжэй у сваей прадмове, што менаванае выданьне „мае на мэце задаволіць патрэбы навукова-дасьледчага і навучальнага характару“... Прадмову, таксама „навуковую“, аб жыцьці і творчасьці Цёткі, напісаў М. Пятровіч, якая стаіць ніжэй сэмінарыйнае працы першагодняга студэнта.

З гэтакай навуковасьцю, якую праявіла Беларуская Акадэмія Навук у выданьні „Твораў“ Цёткі, далей Менску не заедзеш.

Пры гэтым варта зазначыць, што такое ігнараваньне навукі дзеля агітацыйных мэтаў робіцца толькі ў Савецкай Беларусі.

Бальшавіцкія ўлады, закрываючы ўсякімі спосабамі нацыянальны характар беларускае культуры, консэквэнтна імкнуцца да русыфікацыі Беларусаў. У Маскве й Ленінградзе такіх экспэрымэнтаў з навукай, як гэта мы паказалі толькі на адным прыкладзе з выданьнем твораў Цёткі,—а такіх прыкладаў ёсьць мноства — ня робяць ніколі. Там і сяньня друкуюць і распаўсюджываюць поўныя выданьні твораў Пушкіна, Дастаеўскага і іншых дарэволюцыйных пісьменьнікаў. А хіба-ж ня трэба даводзіць, што творчасьць апошніх ёсьць больш „буржуазная", чымся Цёткі, натхнёнае пясьняркі рэволюцыі.

Канчаючы, трэба зрабіць яшчэ адну зацемку. Выданьне „Твораў" Цёткі зроблена паводле новага правапісу, што год назад прымусова ўвялі бальшавікі. Як ведама, гэтая зьмена правапісу была адначасна зьменай граматыкі: на мейсца некаторых хвормаў беларускіх уводзіла яна хвормы расейскія. Між іншым замест хвормаў беларускіх сьвету, народу, прынята пісаць парасейску—света, народа. Замест братом, аб братох, кіраўніком, аб кіраўнікох, накінуты расейскія хвормы— братам, аб братах, кіраўнікам, аб кіраўніках. Вось-жа вельмі часта такія хвормы трапляюцца ў вершах на канцы радка. Прыстасоўваючы такім спосабам вершы нашых поэтаў да т. зв. новага правапісу, вельмі часта нарушаецца рымаваньне верша. Вось прыклад з верша Цёткі п. н. „Ласы":

Было дасюль:

Навяду масты з матэрыялу,
. . . .
Але і пану генералу....

Цяпер:

Навяду масты з матэрыяла,
. . . .
Але і пану генералу,...

Такім спосабам рымаваньне нарушаецца і верш многа траціць на сваей поэтыцкай вартасьці. І сапраўдны будзе вандалізм, як Беларуская Акадэмія Навук пачне такім спосабам перарабляць высока мастацкія і мілагучныя вершаваныя творы Я. Купалы і Я. Коласа.

Ст. Ст.

RUCH REGJONALISTYCZNY w EUROPIE.

Książka zbiorowa pod redakcją Aleksandra Patkowskiego. Warszawa, 1934 r. Wydawnictwo Sekcji Regjonalistyczno-Krajoznawczej Związku Nauczycielstwa Polskiego. t.t. I, II.

Пад гэткім назовам у канцы мінулага году на кнігарскім рынку паказалася двутамовая кніжка. Спатыкаем у ёй, як гэта відаць з самага загалоўку, апісаньне рэгіональнага руху ў большасьці дзяржаваў Эўропы. Рэгіональны рух кожнага краю апісваюць там аўтары, якія зьяўляюцца грамадзянамі яго.

Рэгіоналізм — ад лацінскага *regio*: краіна, ваколіца, правінцыя, — агулам яго разважаючы, азначае краезнаўства. Вось-жа беларускаму чытачу знаёміцца з літаратурай, апісваючай жыцьцё розных краёў і народаў, ёсьць рэчай пажаданай і карыснай. Пажадана і карысна беларусу такжа ведаць, як людзі апісваюць розныя краі і народы. Дзеля гэтага і пасьвячаем успомненай кнізе гэтых некалькі ўваг.

Прадусім трэба адзначыць, што агульная тэндэнцыя аўтараў паасобных артыкулаў у кнізе „Ruch Regjonalistyczny w Europie“, гэта—з малымі выняткамі, апісваць рэгіоналізм дзяржавы, мінаючы нацыяналяныя рухі, якія ў іхных дзяржавах існуюць. І затым спатыкаем там шмат апісаньня рэгіоналізму адміністрацыйнага, гаспадарскага, географічнага і інш., а як найменш рэгіоналізму культурна-нацыянальнага. Тымчасам ясная рэч, што ў пазнаньні кожнага краю, у кожным рэгіоналізьме, найважнейшай рэчай зьяўляецца пазнаньне ў кожным краю існуючага народу, яго патрэб і імкненьняў.

Характэрна, што рэкорд у гэтым кірунку пабілі польскія аўтары трох розных артыкулаў. Дарэмна ў гэтых артыкулах чытач шукаў-бы хоць успаміну аб беларусах, украінцах, літоўцах і аб іх краінах, што ўваходзяць у склад сучаснай Польшчы!

Аб тым, што ў Польшчы існуюць няпольскія народы, якія прадусім і мусілі-б быць галоўным крытэрыем рэгіоналізму, інформуе чытача „Ruchu Regjonalistycznego w Europie“... швайцарскі прафэсар Jean de La Harpe (II, 239), які дараджае Польшчы разьвязаць справу сваіх нацыянальных меншасьцяў праз шырока і шчыра зразумелы рэгіоналізм. Сапраўды, іронія лёсу!

Аб рэгіоналізьме ў Саветах апісвае расейскі праф. з Прагі Пётра Савіцкій. Да савецкага краезнаўства і рэгіоналізму, а разам з гэтым і да беларусаў, аднёсься ён цалком об'ектыўна, падчэрківаючы, што Саветы рэгіоналізм свой апёрлі бадай у першую чаргу на нацыянальнасьцях, надаючы аднак культурным іх рухам нацыянальную толькі форму, гэта знача—мову, а зьмест—выключна камуністычны. **Ад. Ст.**

Witold Dynowski: Barwne kufry chłopskie z okolic Wileńszczyzny i Pińska. Wilno, 1934 r. Nakładem Instytutu Naukowo-Badawczego Europy Wschodniej.

Гэта першая праца Сэкцыі Этнолёгічнай Інстытуту Навукоковага Дасьледжваньня Эўропы Усходняй у Вільні. Вонкавы выгляд яе раскошны. Вокладка. папера, малюнкі, яўна сьведчыць аб заможнасьці Інстытуту. Коштаў, уложаных на выдавецтва гэтай кніжкі, нам беларусам хапіла-б ня толькі на „Barwne Kufry Chłopskie", але й яшчэ на сёе-тое шмат ад „куфраў" важнейшае.

Але паглядзім у сярэдзіну гэных куфраў, што ў іх? Вось-жа, калі йдзе аб зьмест гэнай кніжкі, дык мусім сьцьвердзіць, што аўтар у яе шмат улажыў працы і веды. Адведаў ён асабіста многія мясцы Віленшчыны і Палесься, вёў асабістыя гутаркі з асобамі, якія нешта зналі аб куфрах, аглядаў не адзін куфар уласнымі вачыма, а так-жа выкарыстаў даволі багатую літаратуру, сярод якой так-жа й беларускую. Так напр. у сьпісе літаратурных крыніц спатыкаем працы датычныя беларускай народнай культуры: Баброўскага, Дэмбавецкага, Корэвы, Романова, Шэйна, Шлюбскага, Тышкевіча і Зеленскага.

Праца такім чынам В. Дыноўскага бязумоўна мае сваю навуковую вартасьць, што лёяльна і падчоркаваем. Аднак мусім сьцьвердзіць, што В. Дыноўскі, гаворачы аб куфрах на нашых землях не сказаў аб іх усей праўды. Ён галоўнае якраз схаваў у „куфрах" і беларускаму этнолёгу, які будзе карыстацца гэтымі „куфрамі" В. Дыноўскага, не адну рэч з іх прыдзецца выцягваць на верх: дапаўняць, выясьняць.

Справа ў тым, што „куфры" В. Дыноўскага, як прадметы культуры народу беларускага і літоўскага, гэтыя нацыянальныя адзнакі схавалі ў нутры сваім.

В. Дыноўскі, пішучы свае „куфры", даведваўся між іншым і аб варштатах, у якіх куфры ў нашым краю выраблялiся. Вось-жа інфарматарамі яго ў гэтай справе былі бадай выключна мяшчане-жыды: у Вільні, у Сьвянцянах, у Відзах, у Алькеніках, у Эйшышках, у Лідзе. Тымчасам аўтар не пастараўся знайсьці майстроў беларусаў і літоўцаў, якія так-жа існуюць і якія сапраўды маглі-б нешта цэннае сказаць аб прадмеце свайго культурнага творства.

Мінаючы, відаць сьведама, культуры беларускага і літоўскага народу, В. Дыноўскі часта спатыкае і сьцьвярджае на куфрах нашага краю ўплывы культуры Усходу і Заходу, але ня бача, што з крыжаваньня гэных уплываў, з сынтэзы іх, асабліва на беларускіх этнографічных землях, паўставала арыгінальная беларуская культура.

Прыкрым так-жа зьявішчам у працы В. Дыноўскага ёсьць і тое, што ён у нашым краю бачыць толькі „lud Wileńszczyzny i Polesia", (прычым пад словам „Polesie" крыецца беларуская

Наваградчына), а ня бачыць беларусаў. і літоўцаў, бачыць у „куфрах“ гэтага „ludu“ імглістыя ўплывы старых культур Усходу і Заходу, а ня бачыць у іх сьлядоў арыгінальнай культуру народаў нашага краю.

Ад. Ст.

Józef Gołąbek: „LITERATURA BIAŁORUSKA“, „Wielka Literatura Powszechna“ pod redakcyją Dr. St. Lama. Nakładem Księgarni Trzaski, Ewerta i Michalskiego, t. IV. (539 — 546) i „LITERATURA BIAŁORUSKA“ t. VI (Antologja. Wybór tekstów i układ Alfreda Toma. 736—746). Warszawa, 1933 г.

„Wielka Literatura Powszechna“ —гэта багатая энцыклёпэдыя сусьветнае літаратуры, хораша выданая ў шасьці томах вялікага фармату. У чатырох першых томах маем агульны агляд сусьветнае літаратуры ад часоў найдаўнейшых да сучаснасьці. У т. IV гаворыцца аб літаратурах славянскіх. У тт. V і VI (Антолёгія) зьмешчаны найбольш характэрыстычныя творы вялікіх поэтаў і пісьменьнікаў розных народаў у польскім перакладзе.

Артыкул аб беларускай літаратуры напісаў доцант Варшаўскага Ўнівэрсытэту Язэп Галомбак, ведамы із сваіх працаў з беларускай і іншых славянскіх літаратураў. Аўтар дае агульны агляд беларускае літаратуры ад пачатку яе разьвіцьця, канчаючы кароткімі зацемкамі аб сучаснай беларускай літаратуры ў Усходняй і Заходняй Беларусі. Агульны абраз разьвіцьця беларускае літаратуры аўтар намаляваў даволі добра; больш менш правільна прадставіў галоўныя яе кірункі і ўмела схарактэрызаваў у кароткіх словах творчасьць паасобных поэтаў і пісьменьнікаў. З гэтага боку артыкул Я. Галомбка ніякіх засьцярогаў не выклікае. Затое, гаворачы аб адносінах беларускай літаратуры да польскай, аўтар не патрапіў быць об'ектыўным. З усяго артыкулу выглядае, што беларуская літаратура, амаль праз увесь час свайго існаваньня, у пераважнай меры вырастала і разьвівалася на літаратуры польскай. Польскія ўплывы на беларускую літаратуру ў такой меры, як гэта бачыць аўтар амаль ўва ўсіх яе пэрыядах, можна спасьцярагаць толькі ў першай палавіне XIX ст., у творчасьці беларускіх романтыкаў, вышаўшых з польскае школы (Я. Чачот, В. Д. — Марцінкевіч і іншыя). Затое ўва ўсіх іншых пэрыядах, асабліва ў часе найбуйнейшага росквіту беларускае літаратуры, вырастала яна поўнасьцю на собскім грунце. А калі і спатыкаліся часамі ўплывы некаторых польскіх поэтаў, то былі яны спорадычнымі. На іх падставе аб залежнасьці беларускае літаратуры ад польскай гаварыць ня прыходзіцца, бо ёсьць зьявішчам нормальным, што ў літаратуры кожнага народу спатыкаюцца часта ўплывы чужых поэтаў і пісьменьнікаў.

Часам знаходзяцца і іншыя памылкі ў артыкуле Я. Галомбка. Аўтар гаворучы аб сучасным літаратурным пакаленьні ў Усходняй Беларусі, на чале яго ставіць М. Гарэцкага, А. Гаруна

і М. Чарота. Не гаворачы ўжо аб тым, ці належыць М. Гарэцкі да сучаснага літаратурнага пакаленьня, ці не, А. Гарун напэўна да яго не належыць, бо памёр у 1921 г.

У тэксьце артыкулу знаходзім фотографіі Фр. Скарыны, В. Д. Марцінкевіча, Фр. Багушэвіча, Я. Купалы і Я. Коласа.

У VI томе менаванага выданьня знаходзім пятнаццаць твораў вершаваных і прозаічных беларускіх поэтаў і пісьменьнікаў, выбраных проф. Альфрэдам Томам. Ён-жа быў і перакладчыкам значнага іх ліку. Апрача яго перакладалі А. Багуслаўскі, М. Рудзінская, Т. Радоньскі і інш. Тут беларускі аддзел пачынаецца вершам Я. Чачота „Каб у карчме не сядзеў“,— потым ідуць некаторыя творы В. Д. Марцінкевіча, Фр. Багушэвіча, Цёткі, Я. Купалы, Т. Гушчы, Ц. Гартнага, З. Бядулі — і канчаецца вершам М. Багдановіча „Слуцкія ткачыхі“. Пераклады беларускіх твораў на польскую мову вельмі добрыя. Яны дакладна перадаюць ня толькі зьмест твораў, але й іх тон і настроі, пры захаваньні агульнага характару верша. Ст. Ст.

З жалобнае карты.

ТОДАР УЛАДЗІМІРСКІ.

„Дзе жыць, дзе тварыць жыцьцё новае трэба,
Там сыплюць магілы, там—сьмерць, пахароны“.
Я. Купала.

У палавіне лістапада мінулага году адыйшоў на вечны супачынак на 65 годзе свайго жыцьця протаярэй Тодар Васільевіч Уладзімірскі, — уталентаваны кампазытар, выдатны арганізатар і дырыгент харавых сьпеваў.

Адыйшоў неспадзявана. Жыцьцё абарвалася, як струна, ня скончыўшая свае мэлёдыі, і жалобным акордам адгукнулася ў сэрцах тых, хто толькі знаў Нябошчыка.

Расеец па паходжаньню, Ён быў зьвязаны яшчэ да вайны з Вільняй і нашым краем. У 1917 годзе быў запрошаны ў склад прафэсарскай калегіі ў аддзеле тэорыі музыкі і сьпеву ў Беларускі Пэдагагічны Інстытут у Менску, дзе працавалі У. Ігнатоўскі, пазьнейшы прэзыдэнт Бел. Ак. Навук, і В. Іваноўскі, цяпер прафэсар Варшаўскай Палітэхнікі, і шмат іншых выдатных беларусаў.

Несьціхаўшыя грымоты вайны і рэвалюцыі бушавалі тады на Беларусі. Людзі зьнемагліся ад страшнай нэрвовай напружанасьці. Шукалі цішыні, спакою. І вось нябошчык Уладзімірскі, шукаючы гэтага спакою, у 1919 годзе прымае духоўны сан і выяжджае на парахвію ў м. Трабы, каля Валожына, адкуль, праз некалькі гадоў, пераежджае на сталае жыцьцё ў Новую-Вялейку.

Выпаўняючы свае пастырскія абавязкі, ён не парывае і са сваей роднай музычнай стыхіяй. Спатыкаючыся беспасярэдня

з беларускай народнай творчасьцяй, с. п. Уладзімірскі распачынае сваю працу над гарманізацыяй беларускіх народных песьняў. У гутарках са сваімі знаёмымі, Ён ня раз з захапленьнем расказвае аб сваіх назіраньнях над хараством і арыгінальнасьцю беларускіх народных мэлёдыяў.

Даступны і ветлівы ў абыходжаньні, Ён ахвотна піша і дае для публічнага карыстаньня свае прыгожыя музычныя творы.

Амаль усе беларускія канцэртныя імпрэзы не абходзяцца без паказу яго творчасьці. Хоць і ня так многа зроблена нябошчыкам для беларускай песьні, але тое, што зроблена, мае вялікую мастацкую вартасьць. Вось кароткі пералік найбольш пашыраных беларускіх песьняў, напісаных Уладзімірскім для мяшанага хору: з Лідзкага павету — „У чыстым полі каліна стаіць" (солё барытон і хор) і „А ў лузі каліна" (солё альт і хор); з Пружаншчыны—„А ў гаспадара" (калядка) і „Ў нашага дружэнька чорныя вочы" (вясельная); з Маладэчанскага павету — „У даль па даліне" (валачобная) і „Ой, бяда-ж мая";—з этн. збор. М. Гарэцкага, — „Пастаўлю сьвятліцу" і „Дзеўкі хмеля садзілі"; з Аўгустоўскага павету—дажынкавая песьня для 3-х жаночых галасоў: „Дажалі жыта да самага бору". Апрача таго спэцыяльна для беларускай моладзі былі напісаны дзьве харавыя песьні: „У сонечных праменьнях" на словы Журбы і „Сьняжыначкі — пушыначкі" на словы Ясакара. Мастацкую вартасьць гэтых песьняў добра знае віленскае грамадзянства, якое цікавіцца беларускімі канцэртамі. Напрыклад „Сьняжыначкі", на апошнім выступленьні беларускага хору ў Віл. Бел. Гімназіі, пад умелым кіраўніцтвам выдатнага культурнага працаўніка гр. Р. Шырмы, былі спатканы з такім захапленьнем, што хор быў змушаны паўтараць іх на жаданьне прысутных. Апрача таго Уладзімірскім задуманы былі вялікія харавыя працы над беларускімі народнымі песьнямі, як напр. сюіта „Чатыры пары году" і інш., аднак на перашкодзе да выпаўненьня іх стала передчасная сьмерць.

Вечная памяць, вечная слава няхай будзе гэтаму добраму прыяцелю Беларускага Народу! **Л. К.**

АЛЬБІН СТЭПОВІЧ.

Дня 18-га сьнежня 1934 г. у Віленскай Літоўскай клініцы памёр ад хворасьці сэрца Альбін Стэповіч, заслужаны беларускі культурны і палітычны працаўнік.

Сьв. пам. А. Стэповіч ёсьць родным братам ведамага беларускага поэта Каз. Сваяка (кс. Каст. Стэповіча), таксама ад 1926 г. ужо нябошчыка. Радзіўся А. Стэповіч у в. Барані, у Сьвянцяншчыне, 18-га сакавіка 1894 г.; вучыўся ў Віленскай музыкальнай школе ім. Монтвіла, а пасьля на праўна-грамадзкім факультэце Казанскага унівэрсытэту і на гуманістычным факультэце Віленскага Унівэрсытэту. Грамадзкім жыцьцём — не бяз уплыву брата Кастантага—А. Стэповіч пачаў цікавіцца яшчэ з вучнёўскіх часоў,

хоць на беларускім грунце шырэй стаўся ведамым толькі ад часу павароту свайго з Казані ў Вільню ў 1921 г.

З гэтага часу бачым сьв. пам. А. Стэповіча на становішчах: настаўніка Віленскай Беларускай Гімназіі (сьпеў), старшыні Віленскага Аддзелу Бел. Інст. Гасп. і Культуры, віцэ-старшыні Ц.К. —Б.Х.Д. і пасла ў сойм ад імя тэй-жа Б.Х.Д. (1928—1930), супрацоўніка і выдаўца (1927—1930) „Беларускай Крыніцы“, кіраўніка Беларускага Касьцельнага Хору, ініцыятара закладчыка і кіраўніка вольных дыскусыйных вечароў, г. зв. „пятніцаў“, і пільнага рэфэрэнта беларускіх справаў у даступнай яму замежнай і наагул небеларускай прэсе. Галоўным заняцьцем яго ў апошніх часох аднак была публіцыстыка. Але што раз больш аддаваўся ён і музыцы, — агульнай і беларускай перадусім. З працы гэтае выдадзены друкам аднак толькі лічаныя нумары, ды і то не асобна, а ў розных выданьнях і зборніках. Найбольшая аднак часьць працаў нябошчыка знаходзіцца ў рукапісах і чакае на сумленнага дасьледчыка і выдаўца. Асобна выдадзены дагэтуль толькі гімн Бел. Інстытуту Гасп. і Культ.: „Дзе чутны мовы нашай гукі“ — на 4 мяшаныя галасы à capella, да якога А.С. напісаў ня толькі музыку, але і словы. У апошніх днях жыцьця свайго ўлажыў нябошчык плян выдавецтва беларускіх популярных, народных і рэлігійных, песеньнікаў. З гэтага пляну пасьпеў аднак нябошчык выканаць толькі пачатак: хворым ужо будучы сьмяротна, выканчыў ён толькі першы сшыток гэтага выдавецтва, выхаду якога ў сьвет друкам аднак ужо не дачакаўся. Схварэлае сэрца перастала біцца. Асталася толькі памяць, якую пагомнае пакаленьне захавае ў прыклад сабе і дзеля прадаўжэньня працы над усестаронным адбудаваньнем Беларусі, для каторай нябошчык быў верным да апошняй хвіліны. Вечная Яму памяць!

Экспортацыя цела з касьцёла сьв. Мікалая на могілкі Россы, на Горку літэратаў, і паховіны адбыліся 19. XII. 1934 г.

Культурная хроніка.

Зьезд пісьменьнікаў БССР.

Зьезд савецкіх пісьменьнікаў БССР зьяўляецца важным фактам у разьвіцьці беларускай што да формы, а сацыялістычнай што да зьместу культуры.

На гэтым зьезьдзе першы раз за ўвесь час свайго існаваньня БССР падсумавала зробленую за 15 год працу ў галіне літаратуры і мастацтва, намеціла плян далейшых шляхоў і падлічыла свае пісьменьніцкія кадры. Да зьезду рабіліся даўгія прыгатаваньні. Савецкая Беларусь прышла да першага зьезду пісьменьнікаў са значным багажом літаратурна-мастацкага творства і з вялікімі кадрамі старэйшых і малодшых пісьменьнікаў.

8-га чэрвеня 1934 г. у Менску — сталіцы Савецкай Беларусі

ў салі гарадзкога тэатру адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд савецкіх пісьменьнікаў.

У зьезьдзе прымала ўдзел каля 100 дэпутатаў, у тым ліку дэлегацыі ўсесаюзнага аргкамітэту пісьменьнікаў на чале з Бахмецевым, дэлегаты заходняй вобласьці (Смаленшчыны), заслужаны артыст рэспублікі Міхоэльс, народны артыст рэспублікі Галубок, начальнік палітаддзелу N-скай дывізіі Крапачоў і інш.

Зьезд адчыніў старшыня аргкамітэту ССПБ (Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі) М. Клімковіч.

У прэзыдыюм былі выбраны: Галадзед,, Чарвякоў, Рыскін, Конік, Кавальчук, Чарнушэвіч, Аўгустайціс, Домбаль, Ленцнэр, Ратнек, Варончанка, Клімковіч, Колас, Купала, Александровіч, Галавач, Дунец, дэлегаты ўсесаюзнага аргкамітэту і пісьменьнікаў заходняй вобласьці і інш.

У ганаровы прэзыдыюм выбраны Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з Сталінам, Бюро ЦК КП(б)Б на чале з Гікало, Тэльман (нямецкі камуніст), Дзімітраў (баўгарскі камуніст).

Ганаровым старш. зьезду выбраны А. М. Горкі. Зьезд пастанавіў выбраць Отто Шмідта ганаровым сябрам прэзыдыюму зьезду.

У салі было прысутных звыш 700 гасьцей—ударнікаў фабрык і заводаў і прадстаўнікоў партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацыяў.

9-га чэрвеня паседжаньне зьезду адкрылася ў Доме Пісьменьнікаў дакладам М. Клімковіча на тэму: „Савецкая літаратура БССР за 15 год".

М. Клімковіч у сваім дакладзе схарактэрызаваў згодна з прынцыпамі камунізму ідэолёгічны бок беларускай творчасьці, пачынаючы ад пісьменьнікаў Дуніна Марцінкевіча, Багушэвіча і інш., народніцкую і „нашаніўскую" пару ўключна аж да Лютаўскай і Кастрычнікавай рэволюцыі, далей „нацдэмаўскую" дзейнасьць на літаратурным фронце ў БССР і ўрэшце спыніўся над сучаснай мастацкай літаратурай БССР. Сцьвярдзіў вялікія ідэолёгічна-камуністычныя недахопы сав. літаратуры БССР, якая толькі з вялікім трудам пачынае выламлівацца з нацыянальных рамак і выходзіць (у апошнія гады) на ўзровень інтэрнацыёнальнай літаратуры. Пасьля дакладу М. Клімковіча выступілі з дакладамі Бранштэйн—аб прозе і Кучар—аб паэзіі.

10-га чэрвеня зьезд заслухаў даклад Вольскага аб драматургіі і выступленьне Дунца аб жыдоўскай савецкай літаратуры БССР. Пасьля гэтага распачаліся спрэчкі аб дакладзе Клімковіча, Бранштэйна, Кучара і Вольскага. Першымі выступілі — Галавач, Колас і Мікуліч. Пасьля выступаў старшыня СНК БССР Галадзед. Прамова Галадзеда мела характар агульны і цалком палітычны.

11-га чэрвеня выступалі з прамовамі на зьезьдзе пераважна непісьменьнікі і ўраднікі савецкіх грамадзкіх установаў, напр. старшыня ЦК профсаюзу друкароў Магідаў, які прымаў удзел у работах зьезду пісьменьнікаў, народны камісар асьветы БССР А. Чарнушэвіч і інш.

Далей у гэты-ж дзень выступалі: Рубіна, Кірылаў (Саюз Пісьменьнікаў Мардоўскай рэспублікі), Орнштэйн (Саюз Савецкіх Мастакоў) і Леўман (сябра брыгады ўсесаюзнага оргкамітэту).

12 га чэрвеня зьезд выслухаў даклад рэдактара літ. газэты „Raudonasis Artojus“ Вайшнорэса, прысьвечаны літоўскай савецкай літаратуры БССР. На гэтым-жа паседжаньні з прывітаньнем ад імя камуністычнага ўнівэрсытэту нацменшасьцяў Захаду (Масква), выступіў Пранкунас, які таксама гаварыў аб становішчы і разьвіцьці літоўскай сав. літаратуры. Апрача літоўцаў з прамовамі выступалі: З. Бядуля, І. Шапавалаў, Ц. Гартны, М. Хведаровіч, М. Зарэцкі, Л. Кацовіч і Л. Бэндэ.

У адказ на выступленьні ад зьезду са словам выступіў вядомы дзіцячы пісьменьнік Янка Маўр.

На вячорным паседжаньні 12-га чэрвеня з прамовамі выступалі Ул. Бахмецеў (старшыня беларускай брыгады ўсесаюзнага оргкамітэту) і загадчык аддзелу культуры і прапаганды ЦК КП(б)Б Конік.

Пасьля прамовы Коніка, які прапанаваў зьезду зладзіць літаратурны паход імя І Зьезду Сав. Пісьм. Беларусі — зьезд пастанавіў арганізаваць гэты паход у калгасы і саўгасы.

Далей 13-га чэрвеня зьезд выслухаў выступленьні ў спрэчках Мальцінскага, Броўкі, Чарота, Некрашэвіча, Бравковіча і інш.

На вячорным паседжаньні гэтага-ж дня выступіў з вялікім рэфэратам А. Александровіч, які гаварыў аб выключнай патрэбе разгортваньня шырокай самакрытыкі, барацьбы за якасьць творчасьці пісьменьніка, супроць лёзунгаўшчыны і схэматычнасьці, за пролетарскую культуру і мастацкасьць мовы. Пасьля прамовы ў спрэчках выступілі: Глазарын, Кручкін, Раманоўская і Пётуховіч.

Выступленьнем Аўгустайціса закончыліся спрэчкі аб дакладзе М. Клімковіча, Браніштэйна, Кучара, Вольскага і Дунца. Заключнае слова зрабіў Дунец.

14 га чэрвеня Усебеларускі Зьезд Савецкіх Пісьменьнікаў зачыніўся.

Зьезд выбраў у сябры ўраду Саюзу Сав. Пісьм. Беларусі: Коніка, Клімковіча, Лынькова, Браніштэйна, Александровіча, Дунца, Харыка, Коласа, Купалу, Чарота, Бравковіча, Чорнага, Броўку, Вольскага і Галавача. Кандыдатамі выбраны: Жарскі, Крапачоў, Аксельрод і Гурскі.

У склад рэвізыйнай камісіі выбраны: Крапіва, Мурашка, Бядуля, Цішка Гартны і Кульбак. Адначасна зьезд вызначыў дэлегатаў на ўсесаюзны зьезд савецкіх пісьменьнікаў з правам рашаючага голасу 22 асобы і як гасьцей без права рашаючага голасу 12 асоб.

На старшыню ўраду ССПБ (Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі) выбраны: М. Клімковіч, нам. старшыні Андр. Александровіч, адказным сэкратаром—Браніштэйн.

М. Пяцюкевіч.

Зьезд славянскіх філёлёгаў у Варшаве 23 — 30 верасьня 1934 г.

На першым зьезьдзе славістых (славянскіх філёлёгаў) у Празе 1929 г. было пастаноўлена, каб кожны пяты год бывалі такія зьезды ў сталіцы якога славянскага гаспадарства. Другі зьезд славістых і быў летась у верасьні ў Варшаве.

Як звычайна на падобных зьездах, былі на ім ня толькі славяне, але й славістыя неславянскіх народаў. На апошнім зьезьдзе найболей было палякоў, бо зьезд быў у іхняй сталіцы, за палякамі па колькасьці йшлі чэхі й украінцы, а ў меншай колькасьці былі прадстаўнікі ўсіх славянскіх народаў. З неславянаў найболей было немцаў, але былі й французы, ангельцы, італьянцы, скандынавы, фіны і іншыя. Бальшавікі нікога на гэты зьезд ня пусьцілі, дык і ад беларусаў былі толькі прадстаўнікі із Зах. Беларусі, пайменна — д-р Я. Станкевіч і В. Грышкевіч *).

Зацікаўленьне беларушчынай на 2-м зьезьдзе было большае, як на першым. Відавочна прычыны гэтага таго-ж характару філёлёгічнага. Ня гледзячы на ўсе нягоды, беларуская філёлёгія памалу разьвіваецца, што спрыяе зацікаўленьню беларускімі тэмамі і на'т наагул беларускім жыцьцём славістых славянскіх і неславянскіх народаў. Зрабіла тут сваё й „Родная мова“, выдаваная ў 1930 — 1931 г. На зьезьдзе можна было даведацца, што яна выклікала зацікаўленьне да беларускага языка і яе славянскія філёлёгі цэняць.

Д-р Я. Станкевіч меў на зьезьдзе рэфэрат на тэму: „Задачы беларускае дыялектолёгіі“. З прычыны малое лічбы беларускіх дэлегатаў, усе іншыя рэфэраты на беларускія тэмы мелі на зьезьдзе небеларусы. Проф. Франц. Буяк чытаў рэфэрат на тэму: „Сяліба Радзімічаў і Вяцічаў перад іх прыходам на Сож і Аку“. Тэма гэтая знаёма беларускім чытачом з арт. Я. Станкевіча „Беларускія плямёны і іхняе расьсяленьне“ ў „Роднай мове“ № 1—2 і 3—4. Фляроўскі ў рэфэраце „Новае аб д-р Францішу Скарыне ў Празе“ паведаміў, што д-р Фр. Скарына ў трыццатых гадох XVI стаг. быў лекарам на двары чэскага караля Фэрдынанда. Л. Асоўскі чытаў рэфэрат аб лінгвістычнай географіі Заходняе Беларусі. Асоўскі, як у рэфэраце, так і ў артыкулах, выказуе знацьцё прадмету дасьледаваньня і патрапляе ўсьцерагчыся абмылаў, каторыя нярэдка грашаць дасьледавальнікі беларускага языка небеларусы.

На найшырэйшую тэму беларускую быў рэфэрат М. Рудзіншчышкі „Характарыстыка ўрадовага языка Вялікага Княства Літоўскага“. Рудзіншчышка дайшла да агульнага вываду, што ўрадовым языком Вял. Кн. Літоўскага быў язык беларускі. Спа-

*) На першым зьезьдзе ў Празе ад беларусаў з Радавае Беларусі быў украінец П. Бузук, каторы лёяльна прадстаўляў беларускую навуку. Як перадавалі на зьезьдзе летась украінскія філёлёгі, П. Бузук быў пазьней арыштаваны ў Менску разам з беларускімі „нацдэмамі“. Каб скончыць свае мучэньні ў турме, Бузук абліў там сябе бэнзынай і падпаліў. Яго адратавалі, але посьле пeражытага ён страціў здольнасьць да навуковае працы.

чатку аднак—паводле Р.—урадовая мова Вял. Кн. Літоўскага была „ў рэдакцыі ўкраінскай“, прычым гэта рэдакцыя ўкраінская ў Р. няўпрыцям пераходзіць у пераважаючы ўкраінскі элемэнт таго часу. З паглядам такім нельга згадзіцца, і ён ня быў даведзены Р. Што датычыць польскага ўплыву на старую беларускую мову літаратурную—адначасна ўрадовую Вял. Кн. Літоўскага,—дык ён у сваім часе (пачынаючы з XVI стаг.) быў, але быў у ладнай меры йнакшы, чымся яго прадставіла Р.

У сваіх агульных вывадах Р. меней дапяла, чымся гэта было даўно ўстаноўлена Карскім. Але яна ад доймаў і паглядаў перайшла да дасьледаваньня апрычоных асаблівасьцяў з гледзішча нацыянальнае прыналежнасьці менаванае мовы. Гэта вельмі важна. Р. узышла на праўдзівую дарогу.

Апрача таго на зьезьдзе разглядаліся тэмы, супольныя Беларусам з іншымі славянамі **І. С.**

Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы пры Унівэрсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні.

Ужо пяты год вядзе на Віленскім Унівэрсытэце сваю працу Студэнскае Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы. Куратарам Т-ва ад яго закладзінаў зьяўляецца прафэсар У.С.Б. д-р Эрвін Кашмідар. Мэта Т-ва—гуртаваць людзей—перадусім студэнскую моладзь,—для навуковай працы ўва ўсіх галінах беларусаведы.

З пачаткам 1934—1935 акадэміцкага году ў Т-ве працуюць сэкцыі: філёлёгічная, этнографічная, гістарычна-эканамічная і літаратурная. Падчас васеньніх месяцаў м. г. адбылося 5 навуковых зборак Т-ва, на якіх чыталіся і абгаварываліся наступныя працы й рэфэраты:

4/XI—абс. Я. Хвораст прачытаў свой этнографічны матар'ял аб вясельных абрадах на Палесьсі, сабраны летам.

11/XI—д-р Я. Станкевіч прачытаў рэфэрат „Беларусіка на Зьезьдзе Славянскіх Філёлёгаў у 1934 г.“.

18/XI—абс. М. Пяцюкевіч прачытаў рэфэрат: „Марксіцкія мэтады ў этнографічных досьледах у СССР“.

25/XI—д-р Я. Станкевіч, мгр. С. Станкевіч і студ. В. Тумаш адчыталі сваю колектыўную працу на тэму: „Мова беларускай прэсы ў Вільні.

16/XII—д-р Я. Станкевіч прачытаў рэфэрат: „Мейсца паходжаньня і аўтары беларускага летапісу“.

Апрача працы над распрацаваньнем паасобных пытаньняў, Т-ва зьбірае этнографічныя і лінгвістычныя матар'ялы, а таксама мае сваю, тымчасам вельмі скромную, бібліётэку. У бібліётэцы ёсьць каля 280 кніг навуковага і літаратурнага зьместу.

Збор рукапісаў мае ўжо некалькі дзесяткаў рукапісаў этнографічнага і лінгвістычнага матар'ялу з зямель Зах. Беларусі.

Філёлёгічная сэкцыя Т-ва прыступае ў гэтым годзе да апрацаваньня практычнага польска-беларускага слоўніка. **В. Т.**

Беларускі Загранічны Архіў у Празе.

Беларускі Загранічны Архіў у Празе існуе з 1928 году. Заснаваны стараньнем беларускае эміграцыі і знаходзіцца пад пратэктаратам Міністэрства Загранічных Справаў Чэхаславацкае рэспублікі. Мае на мэце зьбіраньне і перахоўваньне друкаваных, а таксама і рукапісных матар'ялаў з гісторыі беларускага вызвольна-адраджэнскага руху: гэта ёсьць архіў вызвольнага змаганьня. Мае чатыры аддзелы: 1) аддзел дакумантаў, які складаецца пераважна з архіўных матар'ялаў Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі і дыплёматычных місыяў ураду Б.Н.Р.; 2) бібліётэка беларусазнаўства—беларускія выданьні і выданьні аб Беларусі ў іншых мовах; 3) аддзел пэрыядычных выданьняў—часапісы, газэты, аднаднёўкі і адозвы; 4) аддзел беларускае бібліографіі—гістарычная бібліографія і картотэка па ўсіх пытаньнях беларусазнаўства. Загадчыкам архіву зьяўляецца д-р Тамаш Грыб, а пратэктарам ад Міністэрства Загранічных Спраў Чэхаславацкае рэспублікі – проф. д-р Ян Славік, вядомы чэскі гісторык, шчыры прыхільнік беларускае справы. Адрас архіву: Tchecoslovaquie, Praha IV, Hradčanské námêsti, Toskansky palac. **Т. Г.**

Жалобная Акадэмія ў чэсьць проф. Бр. Эпімах-Шыпілы.

У канцы мінулага году беларускае грамадзянства ў Вільні даведалася аб сьмерці проф. Браніслава Эпімах-Шыпілы, які памёр 6.VI. 1934 ў Ленінградзе. З гэтай нагоды Бел. Інст. Гасп. і Культуры ў чэсьць нябошчыка 8.XII. 1934 г. ладзіў акадэмію, на якой, пасьля ўступнага слова старшыні Інстытуту Кс. В. Гадлеўскага, аб жыцьці і дзейнасьці проф. Бр. Эпімах-Шыпілы прачытаў рэфэрат Кс. А. Станкевіч.

Проф. Бр. Эп.-Шыпіла—гэта адзін з першых і найбольш заслужаных піонэраў і пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэньня.

Бліжэй аб гэтым Вялікім Беларусе грамадзянства наша даведаецца з наступнай кніжкі „Калосься“, у якой будзе зьмешчаны аб ім рэфэрат Кс. А. Станкевіча.

—о—

Беларуская мова на Гуманістычным Факультэце Унівэрсытэту Сьцяпана Батуры ў Вільні.

На аддзеле Славянскае Філёлёгіі Віленскага Унівэрсыт. ведамы проф. д-р Эрвін Кашмідар выкладае ў бягучым акадэмічным годзе беларускую мову паводле наступнае праграмы: 1. Гістарычная граматыка беларускае мовы—2 гадз. у тыдзень (аўторкі і пятніцы 8—9 гадз.) і 2. Чытаньне беларускіх тэкстаў і ацэнка сэмінарыйных працаў—2 гадз. у тыдзень (пятніцы 9—11 гадз.). Апрача гэтага пры Гуманістычным факультэце Унівэрсытэту стала існуе лектарат беларускае мовы, які вядзе знаны беларускі языкавед д-р Ян Станкевіч. Лектарат адбываецца два разы ў тыдзень (суботы ад 3 да 5 гадз.).

—о—

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры

Рэдакцыйная Калегія: М. Шкялёнак, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, Ст. Станкевіч і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Да Беларускага Грамадзянства.

„Калосьсе“ — гэта адзіны літаратурна-навуковы часапіс у Заходняй Беларусі. Дзеля разьвіцьця й пашырэньня роднае культуры, выдаваньне яго есьць неабходным грамадзкім наказам. Але пашырэньне і пасьпех часапісу перадусім будзе залежыць ад зразуменьня й матар‘яльнае помачы Беларускага Грамадзянства. Выдаецца „Калосьсе“ із месячных складак і ахвяраў Грамадзянства, якое належна зразумела вялікую патрэбу такога часапісу і горача адклікнулася на нашу просьбу. Усім тым, хто прышоў з матар‘яльнаю помачу ў выдаваньні часапісу, складаем на гэтым месцы шчырую падзяку. Да тых Грамадзян, якія яшчэ не задэкляравалі сваей помачы, — зьвяртаемся з гарачай просьбай зрабіць гэта ў найхутчэйшым часе. Кожны, хто дасьць складку на „Калосьсе“, гэтым прычыніцца да разьвіцьця беларускае культуры.

Рэдакцыя і выдавецтва „Калосься“.
Адрас: Вільня, Завальная вул. 1—3.

Да Беларускага Грамадзянства.

„Калосьсе“ — гэта адзіны літаратурна-навуковы часапіс у Заходняй Беларусі. Дзеля разьвіцьця й пашырэньня роднае культуры, выдаваньне яго есьць неабходным грамадзкім наказам. Але пашырэньне і пасьпех часапісу перадусім будзе залежыць ад зразуменьня й матар'яльнае помачы Беларускага Грамадзянства. Выдаецца „Калосьсе“ із месячных складак і ахвяраў Грамадзянства, якое належна зразумела вялікую патрэбу такога часапісу і горача адклікнулася на нашу просьбу. Усім тым, хто прышоў з матар'яльнаю помаччу ў выдаваньні часапісу, складаем на гэтым месцы шчырую падзяку. Да тых Грамадзян, якія яшчэ не задэкляравалі сваей помачы, — зьвяртаемся з гарачай просьбай зрабіць гэта ў найхутчэйшым часе. Кожны, хто дасьць складку на „Калосьсе“, гэтым прычыніцца да разьвіцьця беларускае культуры.

Выдавецтва.

Да нашых супрацоўнікаў.

ДРУГАЯ КНІЖКА „КАЛОСЬСЯ“ ВЫЙДЗЕ 1-га КРАСАВІКА СЕЛЕТА, А ДРУКАВАНЬНЕ ЯЕ ПАЧНЕЦЦА У ПЕРШЫХ ДНЯХ САКАВІКА. ДЗЕЛЯ ГЭТАГА ВЕТЛІВА ПРОСІМ УСІХ НАШЫХ СУПРАЦОУНІКАУ ПРЫСЫЛАЦЬ ПЕРАД 1-м САКАВІКОМ РУКАПІСЫ СВАІХ ТВОРАУ І ПРАЦАУ ДЗЕЛЯ НАДРУКАВАНЬНЯ ІХ У ЧАСАПІСЕ. РУКАПІСЫ ПРЫСЛАНЫЯ ПАЗЬНЕЙ У ДРУГОЙ КНІЖЦЫ ДРУКАВАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.

РЭДАКЦЫЯ.